

ШТО МОЖА СТАРАСТА ВЁСКІ

АДЭНОІДЫ: НОРМА ЦІ ПАТАЛОГІЯ? 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 ЛЮТАГА 2024 г.
СЕРАДА
№ 42 (30176)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксей ФІЛАНОВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Добраўпарадкаванне і навядзенне парадку на зямлі — гэта не разавая акцыя, а паўсядзённая сістэматычная праца, карпатлівы і працаёмкі працэс. Вынікам мінулага года стаў рамонт 1662 дваровых тэрыторый. Найбольшая колькасць добраўпарадкаваных тэрыторый у горадзе Мінску, іх 858. Па абласцях у сярэднім за год добраўпарадкоўваецца ад 80 да 180 двароў. На бягучы год запланаваны рамонт 1606 прыдамавых тэрыторый».*

# ДабрЫня і дабрынЯ



Фота БелТА

У Віцебскі заапарк гэтымі днямі прыбыло касалапае папаўненне. Медзведзянят выпадкова знайшлі леснікі ў суражскіх лясах, калі распрацоўвалі дзялянку. Малыя, якім не больш за паўтара месяца, засталіся ў бярлозе адны — маму, напэўна, нешта напалохала. Двайняты былі слабенькія, ледзь не загінулі. У заапарку іх адразу пачалі выходжваць, вучыць есці, піць сумесь малака і вяршкоў з бутэлечкі праз соску.

Дзяўчынку назвалі Ягадкай, яе на гэтым тыдні забралі ў Магілёўскі заапарк, дзе ў медзвядзяняці будзе вялікі і пnative прасторны дом. Хлопчык па мянушцы Дабрыня пакуль застаўся ў Віцебску. Да яго ўсе, у тым ліку і дырэктар заапарка Ірына АРЛОВА *(на фота)*, ставяцца як да дзіцяці, якому патрэбны мацярынскі клопат і дабрыня.

## КОРАТКА

- **Белстат: у эканоміцы ў 2023 годзе было занята 67,3 працэнта жыхароў ва ўзросце 15—74 гадоў.**
- У Беларусі за 2023 год знішчана амаль 650 га баршчэўніку Сасноўскага.
- **Беларусь выплаціла працэнтны даход па еўрабондах.**
- Больш за 3 працэнты грамадзян Беларусі атрымалі біяметрычныя дакументы.
- **Абнародаваны адрасы выбарчых участкаў у Беларусі, дзе грамадзяне Расіі змогуць прагаласаваць 17 сакавіка.**
- Каля 1 тыс. пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд могуць паступіць у ВНУ без іспытаў.

Актуальна

## ДАХОДЫ РАСТУЦЬ ХУТЧЭЙ, ЧЫМ ІНФЛЯЦЫЯ

### Летась на шэраг тавараў назіралася зніжэнне цэн

**У апошнія гады з прыняццем шэрагу заканадаўчых і нарматыўных актаў у краіне склалася цэласная заканадаўчая база ў галіне цэнаўтварэння, якая дазваляе кіраваць працэсамі рэгулявання і кантролю за цэнаўтварэннем. З першых дзён года дзейнічае новая рэдакцыя пастановы ўрада «Аб сістэме рэгулявання цэн». Рэгуляванне, уведзенае яшчэ ў 2022 годзе, прывяло да зніжэння інфляцыі, а даходы беларусаў, наадварот, набралі хуткасць. Як адзначыў першы намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іван ВЕЖНАВЕЦ, сітуацыя з цэнамі пастаянна аналізуецца, адсочваецца эфектыўнасць рэгулявання і магчымыя негатыўныя наступствы.**

СТАР. 4

Працоўны старт

## РАБОТАДАВЕЦ ЕДЗЕ Ў... АРМІЮ

### На Віцебшчыне ўкараняюць новыя формы работы з маладымі спецыялістамі

**Прыцягнуць на прадпрыемствы выпускнікоў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых устаноў адукацыі — справа нескладаная. Значна цяжэй стварыць для маладых спецыялістаў, якія робяць першыя крокі ў прафесіі, камфортныя ўмовы працы, падмацаваныя не толькі сацыяльнымі гарантыямі, але і чалавечай увагай і клопатам з боку кіраўніцтва. Яшчэ адной важнай традыцыяй папоўнілася скарбонка добрых пачынанняў Віцебскай абласной прафсаюзнай арганізацыі работнікаў АПК: яна выступіла з ініцыятывай наведвання ў воінскіх часцях маладых спецыялістаў, якія праходзяць тэрміновую службу. Першым напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны адгукнуўся Аршанскі мясакансервавы камбінат.**



СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X
24042

# «НАМ СЁННЯ ТРЭБА ЗРАБІЦЬ ТАК, КАБ КРАІНА БЫЛА МІРНАЙ, СПАКОЙНАЙ, СУВЕРЭННАЙ»

## Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў Мінску Наталля КАЧАНАВА прыняла ўдзел у пасяджэнні Мінгарвыканкама

**На парадку дня — вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця горада ў мінулым годзе і задачы на 2024-ы. Але, вітаючы ўдзельнікаў нарады, сярод якіх міністры, кіраўнікі адміністрацый раёнаў, прадпрыемстваў і арганізацый горада, старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ адзначыў, што ўвага таксама будзе скіравана на ацэнку дзейнасці службовых асоб па выкананні даведзеных паказчыкаў. А галоўная задача пасяджэння — гэта работа па вырашэнні задач, якія пастаўлены на бягучы год.**



Старшыня Мінгарвыканкама звярнуў увагу ўдзельнікаў, што 2024 год асаблівы: завяршаецца пяцігодка, краіна знаходзіцца ў электаральным перыядзе. Гэта значыць, што перад кіраўніцтвам горада, арганізацый і прадпрыемстваў стаіць адна, галоўная, задача — забяспечыць выкананне паказчыкаў, каб людзям жылося лепей і камфортней. Дзеля гэтага патрэбна канструктыўная ацэнка становішча на пачатак года, акрэсленне праблемных пытанняў і азначэнне шляхоў іх вырашэння. Асобна Уладзімір Кухараў падкрэсліў, што для вырашэння пастаўленых задач ёсць усё: ад кадравага патэнцыялу да фінансавага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Трэба толькі добрасумленна і адказна выконваць узятыя абавязацельствы, бо канчатковы рэзультат залежыць ад унёску кожнага.

**Першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ** адзначыла, што сёлета эканоміка Мінска выйшла на аднаўленчую дынаміку па валавым рэгіянальным прадукце, паказчык — больш за 100 %. Добрая сітуацыя склалася па рознічным і аптовым тавараабароце, дзе назіраецца прырост выручкі ў 15,5 %.

Сярод асноўных задач яна назвала рост узроўню заработнай платы, яе своечасовыя выплаты, даступнасць жылля, задавальненне запытаў насельніцтва на харчовыя і нехарчовыя тавары, фарміраванне камфортных і бяспечных умоў жыццядзейнасці.

Гаворачы пра заработную плату, Надзея Лазарэвіч адзначыла, што па выніках года намінальная налічаная зарплата работнікаў у Мінску склала Br2590,3, тэмп росту — 13,1 %. Рэальная ж заработная плата вырасла на 7,6 працэнтнага пункта. Праведзеная Мінгарвыканкамам работа дазволіла ў 12 з паловай раза скараціць колькасць арганізацый, дзе зарплата не адпавядала належнаму ўзроўню. Першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама падкрэсліла, што рост заработнай платы і своечасовасць яе выплат — на асобым кантролі і ў гэтым кірунку вядзецца сістэмная работа, удзел у якой прымаюць усе зацікаўленыя органы дзяржаўнага кіравання.



Першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама адзначыла, што ў 2023 годзе шмат увагі ўдзялялася стварэнню бяспечных умоў працы. Акцэнт быў зроблены на будаўнічыя арганізацыі і прадпрыемствы прамысловасці. Па выніках праверак і рэйдаў мабільных груп з улікам выяўленых парушэнняў складзены рэйтынг будаўнічых арганізацый, які размешчаны на сайце Мінгарвыканкама.

Таксама сярод прыярытэтаў былі названы інвестыцыі. У 2023 годзе ў эканоміку прыцягнута прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове $832,2 млн, што ў 1,3 раза больш, чым у папярэднім годзе. Дзякуючы рэалізацыі шэрагу мерапрыемстваў была забяспечана фінансавая стабільнасць прадпрыемстваў, рост аб'ёмаў прамысловай вытворчасці склаў 7,7 %. Спажывецкі рынак сталіцы поўнасцю задаволіў патрэбы насельніцтва.

Дакладчыца зазначыла, што паспяхова ідзе рэалізацыя праграмы па імпартазамяшчэнні, у якой удзельнічаюць больш за 300 суб'ектаў гаспадарання розных формаў уласнасці, у асноўным — прыватнай і бязведамаснай. Ужо выпушчана больш як 500 найменняў прадукцыі на $2 млрд.

Абагульняючы вышэйсказанае, Надзея Лазарэвіч зазначыла: рэзультаты студзеня гэтага года гавораць аб тым, што, папярэдне, горад выконвае паказчыкі, даведзеныя ўрадам. Створана добрая аснова, суб'екты гаспадарання, раёны і Мінгарвыканкам прыкладуць максімум намаганняў, каб вырашыць усе пастаўленыя на 2024 год задачы.

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава падкрэсліла, што набраныя ў мінулым годзе тэмпы збаўляць нельга. Яна адзначыла добрую работу гарадскіх улад і прадпрыемстваў горада. Аднак разам з тым заўважыла, што, на жаль, не ўсе даведзеныя заданні выкананыя ў поўных аб'ёмах.

«Вы павінны добра ўсведамляць: ніхто ні за каго працаваць не будзе. Калі ёсць патрэба ў змяненнях у заканадаўстве — значыць, трэба рабіць гэта хутка. ...Калі сёння кожны не будзе мець на ўвазе думку аб тым, што выканаць даведзеныя задачы — гэта яго жалезабетонная задача, то нічога не атрымаецца», — падкрэсліла Наталля Качанава. Так, менавіта ад асабістай адказнасці кіраўнікоў, хуткасці прыняцця рашэнняў і іх дакладнасці залежыць паспяховая рэалізацыя тых ці іншых мерапрыемстваў. У адваротным выпадку можа атрымацца як з мерапрыемствамі па лічбавізацыі: у інавацыйным фондзе Мінгарвыканкама штогод рэзервуюцца фінансавыя сродкі, але не асвойваюцца.

Старшыня Савета Рэспублікі даручыла профільнаму міністэрству далучыцца да вырашэння праблемы, прааналізаваць сітуацыю і падрыхтаваць канкрэтныя прапановы. «Прэзідэнт ясна сказаў: кожнаму кіраўніку будзе дадзена ацэнка па рэзультатах. Выкананы задачы — працуй, не выкананы — саступі месца таму, хто можа вырашаць гэтыя пытанні», — адзначыла Наталля Качанава. Асобна спынілася яна на своечасовасці выплат заработнай платы і эфектыўнасці работы прадпрыемстваў, назваўшы іх ключавымі пытаннямі кіраўнікоў рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады. Нядрэнную работу ў гэтым кірунку адзначыла ў Мінску. Аднак падкрэсліла: сітуацыя на ўсіх прадпрыемствах, незалежна ад іх формы ўласнасці, павінна пастаянна кантралявацца.

Таксама Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на неабходнасць развіцця горадоў-спадарожнікаў і нагадала: «Моцная краіна — гэта моцныя рэгіёны».

Спынілася яна і на пытаннях, з якімі людзі прыходзяць на асабістыя прыёмы і звяртаюцца падчас прамых тэлефонных ліній. У прыватнасці сітуацыя, звязаная з будаўніцтвам кватэр у комплексе «Мінск-Свет». Наталля Качанава зазначыла, што праблема існуе: «Тыя сем'і, у якіх няма стартавага капіталу, бяруць крэдыты, растэрміноўкі. А потым не могуць прапісацца...» І даручыла тэрмінова разабрацца з сітуацыяй.

Асаблівую ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі звярнула на тое, што ўсім трэба думаць пра будучыню краіны, яе мір і спакой. Яна выказала падзяку ўсім, хто прымаў удзел у выбарчай кампаніі: «Усім, хто прымаў удзел у выбарчай кампаніі, хто арганізоўваў участковыя, акруговыя камісіі, я шчыра ўдзячная. Усё было арганізавана зладжана. Асобныя словы падзякі — членам, старшыням выбарчых участковых камісій. Людзі адпрацавалі дастойна. Я ўдзячна нашым праваахоўным органам. Усё было дакладна выбудавана, і нідзе не было ніякіх эксцэсаў».

На пасяджэнні Мінгарвыканкама таксама абмяркоўваліся работа будаўнічага комплексу, транспартнай галіны, добраўпарадкаванне, захады па павышэнні эфектыўнасці дзейнасці асобных прадпрыемстваў і арганізацый.

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**
**Фота БелТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кіраўнік дыпламатыі ЕС заявіў, што эра дамінавання Захаду завяршылася



Кіраўнік еўрапейскай дыпламатыі Жазэп Барэль, разважаючы аб цяперашняй геапалітычнай напружанасці ў свеце і адносінах Еўропы з краінамі «Глабальнага Поўдня», заявіў, што эпоха дамінавання Захаду канчаткова завяршылася. Заява апублікавана на сайце знешнепалітычнай службы ЕС, паведаміла РІА «Новости». «Калі цяперашняя глабальная геапалітычная напружанасць працягне развівацца ў кірунку «Захад супраць астатніх», будучыня Еўропы рызыкуе аказацца змрочнай. Эпоха дамінавання Захаду сапраўды канчаткова завяршылася. Хоць тэарэтычна гэта было зразумела, мы не заўсёды рабілі ўсе практычныя высновы з гэтай новай рэальнасці», — заявіў Барэль. На яго думку, сітуацыя для Еўропы пагоршылася ўкраінскім крызісам і ростам эскалацыі на Блізкім Усходзе. «Многія з «Глабальнага Поўдня» абвінавачваюць нас у «двайных стандартах», — дадаў Барэль.

### Парламент Венгрыі абраў прэзідэнтам Тамаша Шуёка



Венгерскі парламент прагаласаваў за прызначэнне старшыні Канстытуцыйнага суда краіны Тамаша Шуёка на пасаду прэзідэнта Венгрыі. Пра гэта паведаміў прадстаўнік урада краіны Золтан Ковач. Шуёк стаў кандыдатам ад кіруючай партыі «Фідэс» і яе малодшага партнёра па кааліцыі — Хрысціянска-дэмакратычнай народнай партыі. Раней венгерскі парламент аднагалосна прыняў адстаўку прэзідэнта Каталін Новак. 10 лютага яна заявіла аб адстаўцы на фоне абурэння грамадскасці наконт яе рашэння памілаваць мужчыну, асуджанага па справе аб сексуальным гвалце над дзецьмі. Выданне Hungary Today паведамляла, што, паводле слоў Новак, яна «прыняла рашэнне аб памілаванні, мяркуючы, што асуджаны не злоўжываў сваім становішчам па рабоце з дзецьмі». «Я не мела рацыі», — дадала яна. Венгерскі прэм'ер Віктар Орбан заявіў, што прапануе папраўку да Канстытуцыі аб праве на памілаванне, якая выключыла б асуджаных, якія маюць дачыненне да спраў аб жорсткім абыходжанні з дзецьмі.

### У Эквадоры затрымалі звыш дзесяці тысяч чалавек



Паліцыя і армія Эквадора ў рамках плана «Фенікс», які быў задзейнічаны для барацьбы з бандамі пасля ўвядзення надзвычайнай сітуацыі, з 9 студзеня затрымалі больш як 10 тысяч чалавек. З іх 268 будуць абвінавачаны ў тэрарызме, гаворыцца ў паведамленні паліцыі. Акрамя таго, было канфіскавана звыш трох тысяч адзінак агнястрэльнай зброі і каля 20 тысяч выбуховых прылад. Як вядома, беспарадкі ў Эквадоры пачаліся пасля ўцёкаў з турмы Гуаякіля двух верхаводаў злачынных груповак у пачатку студзеня. Прэзідэнт Даніэль Набоа абвясціў аб унутраным узброеным канфлікце і загадаў войску нейтралізаваць 22 злачынныя групоўкі, якія налічваюць дзясяткі тысяч удзельнікаў.

Нашы людзі

# НАДЗЕЙНАЯ АПОРА МІЛІЦЫІ

**Добрай традыцыяй ва Упраўленні ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама стала ўзнагароджанне нераўнадушных грамадзян, якія дапамагаюць праваахоўнікам раскрываць злачынствы і папярэджваць здарэнні. Такіх смелых і неабыякавых людзей у паўночным рэгіёне хапае, паказальна, што сярод узнагароджаных ёсць і дзеці.**



У выніку актыўнай дапамогі і спагадлівасці насельніцтва УУС Віцебскага аблвыканкама з 2009 года праводзіць патрыятычную акцыю «Грамадзянская мужнасць». Сёлета яе героямі сталі шэсць чалавек. У намінацыі «Самы юны ахоўнік правапарадку» адзначаны тры... дзяўчынкі. 13-гадовая жыхарка вобласці Дар'я Мароз, вучаніца Крынкаўскай школы Лёзненскага раёна, знайшла кашалёк, у якім знаходзілася 1500 долараў і больш за 200 беларускіх рублёў, а яшчэ членскі білет БРСМ з прозвішчам. Дзяўчынка паведаміла аб знаходцы сваёй маці, а тая перадала інфармацыю ў Лёзненскі РАУС.

12-гадовыя віцябчанкі Анастасія Трус і Дана Пчалаводава знайшлі ў лесапаркавай зоне «Юр'ева гара» мабільны тэлефон. Дзяўчынкі аднеслі яго маці Анастасіі, а тая паведаміла аб гэтым праваахоўнікам Чыгуначнага РАУС г. Віцебска. У ходзе правядзення агляду інфармацыі, якая змяшчалася ў гаджэце, былі атрыманы сведчанні аб супрацьпраўнай дзейнасці двух мужчын — распаўсюджванне асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва «альфа-PVP» шляхам размяшчэння закладак на тэрыторыі Віцебска.

Педагог-псіхолаг адной са школ горада Наваполацка па выніках дыягностыкі выявіла факт сексуальнага гвалту ў адносінах непаўналетняй вучаніцы. Настаўнік перадала інфармацыю дырэктару установы адукацыі, пасля чаго ў сітуацыі сталі разбірацца праваахоўнікі. Аператыўнікі ўстанавілі, што 34-гадовы жыхар Наваполацка на працягу некалькіх гадоў здзяйсняў дзеянні сексуальнага характару ў адносінах сваёй дачкі, якая нічога не расказвала маці. Злачынец затрыманы.

У намінацыі «Народны дэтэктыў» адзначаны Аляксандр Данілаў, які ў сакавіку мінулага года заўважыў у лесапаласе двух невядомых мужчын, якія ў ходзе размовы прызналіся, што шукаюць закладкі. Аляксандр Іванавіч паведаміў аб гэтым старшыні сельвыканкама, а той патэлефанаваў у Віцебскі РАУС. У ходзе затрымання аўтамабіля, які належаў аднаму з падазраваных, аператыўнікі знайшлі асабліва небяспечнае псіхатропнае рэчыва — парамецілэфедрон. Па дадзеным факце была ўзбуджана крымінальная справа за незаконны абарот наркотыкаў.

Самым смелым і рашучым стаў студэнт 4 курса МІТСО Арцём Байрамаў, які аказаў дапамогу супрацоўнікам Верхнядзвінскага РАУС у затрыманні злачынца. У студзені бягучага года маладому чалавеку патэлефанавала знаёмая Ганна, якая прасіла прыехаць па дапамогу. Калі юнак аказаўся ў пад'ездзе дома, каля якога яго чакала знаёмая, то ўбачыў крою, бацькоў Ганны і невядомага мужчыну ў стане алкагольнага ап'янення з нажом у руцэ. Паранены бацька дзяўчыны трымаў руку злачынца з нажом, тады Арцём не разгубіўся і выбіў халодную зброю. Маладому чалавеку ўдалося скруціць незнаёмца, вывесці на вуліцу і ўтрымліваць да прыезду праваахоўнікаў.

Усіх гэтых сумленных і рашучых герояў віншавалі ў Віцебскім УУС. «Акцыя «Грамадзянская мужнасць» — гэта мерапрыемства, на якім мы ўшаноўваем тых, хто не прайшоў міма злачынства. Гэта людзі, якія не разгубіліся ў экстрэмальных сітуацыях, праявілі мужнасць, стойкасць, грамадзянскую адказнасць і дапамаглі затрымаць парушальнікаў закона. Сапраўдныя героі нашага часу, якія ў крытычны момант не думаюць пра тое, дапамагаць міліцыі ці не, а проста дзейнічаюць. Упэўнены, што па-іншаму яны б і не паступілі. Сёння наша работа — па першым званку прымаць меры для затрымання злачынцаў. Але ёсць людзі, якія бачаць тое, што адбываецца, першымі. Іх рэакцыя высакародная і ўсім зразумелая: зло павінна быць пакарана», — адзначыў **першы намеснік начальніка УУС Віцебскага аблвыканкама — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі Аляксей ШАХОВІЧ,** уручаючы заслужаныя ўзнагароды.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Фота УУС Віцебскага аблвыканкама.**

# СВЯТА НАШАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

## Парад да 80-годдзя вызвалення Беларусі пройдзе 3 ліпеня ў Мінску

**Пра гэта паведаміў прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА падчас пасяджэння рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, паведамляе БелТА.**

«На папярэдніх пасяджэннях мы вызначылі асноўныя кірункі работы аргкамітэта і сфармулявалі канкрэтныя даручэнні. Спынюся на асноўных пытаннях, якія мы вырашылі з мінулага пасяджэння. Так, кіраўнік дзяржавы падтрымаў прапанову аргкамітэта аб правядзенні парада войскаў Мінскага гарнізона 3 ліпеня каля стэлы «Мінск — горад-герой». Неабходна забяспечыць якасную падрыхтоўку і правядзенне гэтага парада», — сказаў Раман Галоўчанка.

Ён нагадаў, што на першым пасяджэнні аргкамітэта было вырашана нестандартна і творча падысці да афармлення вуліц і праспектаў Мінска, асабліва тых, назвы якіх звязаны з памятнымі датамі.

«Акрамя таго, трэба сённяя вызначыцца з запрашэннямі замежных гасцей і дэлегацый для ўдзелу ва ўрачыстых мерапрыемствах, а таксама з прыцягненнем моладзі для арганізацыі і ўдзелу», — дадаў прэм'ер-міністр.

Яшчэ адно пытанне датычылася ўзнагароджання населеных пунктаў вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Ім узнагароджаны дзевяць населеных пунктаў Беларусі. Адпаведны Указ № 44 падпісаў 2 лютага кіраўнік дзяржавы.

**Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ** у сваю чаргу адзначыў, што Мінск вельмі сур'ёзна рыхтуецца да 80-годдзя вызвалення Беларусі. «Гэта сапраўды свята для ўсіх беларусаў. Дата гэтая абавязвае нас памятаць пра людзей, якія цаной свайго жыцця дамагліся вызвалення нашай краіны, перамогшы фашызм. Мы падрыхтавалі шмат мерапрыемстваў у сталіцы, будзем афармляць усе знакавыя месцы: і плошчу Перамогі, і Кастрычніцкую плошчу, і праспект Пераможцаў, і праспект Незалежнасці. Комплексны падыход дазволіць кожнаму акунуцца ў святочную атмасферу, адчуць, што сабой уяўляў Мінск тады, 80 гадоў таму, калі пераможцы ўвайшлі ў горад», — падкрэсліў ён.

Паводле слоў Уладзіміра Кухарава, горад плануецца святочна аформіць ужо да 1 мая.

Зямны клопат

# «СЕЙ АВЁС У ГРАЗЬ...»

## На Брэстчыне завяршаецца падрыхтоўка да пасяўной, асобныя гаспадаркі яе ўжо пачалі

**На пасяджэнні аблвыканкама ў канцы мінулага тыдня старшыня камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама Анатоль Шчуплянкоў паведаміў, што адна гаспадарка Маларыцкага раёна 22 лютага прыступіла да сяўбы аўса. Інфармацыя пра сяўбу збожжавай культуры на пачатку трэцяй дэкады лютага крыху змахвала на сенсацыю. Але, як высветлілася, для Маларыччыны гэта не такая ўжо і навіна.**



Фота БелТА.

— Усё залежыць ад надвор'я, — сказаў карэспандэнту газеты **першы намеснік старшыні Маларыцкага райвыканкама Вадзім ГАЛОЎЧЫК.**

— Бывалі розныя гады. Калі ўзяць апошнюю пяцігодку, то 25—28 лютага асобныя гаспадаркі пачыналі сеяць неадноўчы. Акрамя таго, што Маларыцкі — самы паўднёвы раён вобласці, снег тут растае звычайна нашмат раней, чым у іншых раёнах, у нас многа пясчаных глеб. Таму вільгаць сыходзіць параўнальна хутка, важна злавіць момант, пакуль палі насычаны вадой. Па гэтай прычыне спяшаюцца земляробы. Вось і цяпер у ААТ «Чырвоны партызан» за два дні на мінулым тыдні засеялі поле ў 15 гектараў аўса.

«Авёс — такая культура, што ўзыходзіць не адразу, зерне ў параўнанні з іншымі павольна ўбіраецца ў сілу, каб узысці, — працягвае Вадзім Міхайлавіч. — Таму яму не страшна, калі праз некалькі дзён, напрыклад, прымарозіць альбо выпадзе снег, асабліва калі насенне належным чынам падрыхтавана. Нездарма ж з даўніх часоў казалі: «Сей авёс у гразь, будзеш жыць як князь». Усяго ж яравы клін раёна без уліку крупяных культур складае 2700 гектараў. Будзем глядзець па сітуацыі. Калі надвор'е паспрыяе, то тэхніка многіх гаспадарак выйдзе на палі з панядзелка, калі пахаладае, пасяўныя работы адкладуцца на тыдзень-паўтара. Сельгаспрадпрыемствы раёна цалкам падрыхтаваны да веснавых палявых работ».

На пасяджэнні абласнога выканаўчага камітэта ўсебакова зверылі пазіцыі па пытаннях падрыхтоўкі тэхнікі, насення, кадравага забеспячэння веснавых палявых работ. **Старшыня аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** адзначыў, што аграрыі рэгіёна зрабілі з восені добры задзел па ворыве, па ўнясенні арганікі. «Цяперашнія ўмовы спрыяюць таму, каб актыўна ўключыцца ў веснавыя палявыя работы», — сказаў губернатар.

Сёлета ў гаспадарках Брэсцкай вобласці плануюць атрымаць 1,6 мільёна тон збожжа, больш за мільён тон цукровых буракоў, больш за 210 тысяч тон рапсу. У планах таксама нарыхтаваць не менш за 2,2 мільёна кармавых адзінак травяных кармоў. Для нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці раслінаводчай прадукцыі прыняты шэраг мер.

Якіх — расказаў у дакладзе кіраўнік аблсельгасхарча Анатоль Шчуплянкоў: «Была зменена структура азімых збожжавых культур, у першую чаргу за кошт пашырэння такіх высокаўраджайных культур, як пшаніца і ячмень. Сяўба азімых збожжавых культур на зерне праведзена на плошчы 253,5 тысячы гектараў. Восенню зааралі 263 тысячы гектараў. Маніторынг палёў, праведзены раённымі інспекцыямі па насеннаводстве, каранціне і абароне раслін, паказаў, што азімыя ў цэлым у здавальняльным стане, масавай гібелі не назіраецца».

— Для правядзення веснавой сяўбы сельгасарганізацыі вобласці ў цэлым забяспечаны насеннем збожжавых, зернебабовых, цукровых буракоў, лёну, бульбы ў поўным аб'ёме, — паведаміў Анатоль Шчуплянкоў. — Сяўбу яравых культур плануецца правесці на плошчы 408 тысяч гектараў.

Асаблівая ўвага ўдзельнікамі нарады ўдзялялася пытанням падрыхтоўкі тэхнікі. Бо гатоўнасць тэхнічнага парка, як вядома, становіцца першай умовай не толькі своечасовасці палявых работ, але і іх якасці. Спецыялісты канстатавалі, што ў цэлым гатоўнасць сельскагаспадарчай тэхнікі складае больш за 90 працэнтаў, а дакладней, па стане на 20 лютага да выхаду ў поле было гатова 93,8 працэнта трактароў, у тым ліку энерганасычаных — 93,5 працэнта. Пасяўныя агрэгаты гатовы на 92,2 працэнта. Да пачатку палявых работ трэба завяршыць рамонт каля 70 энерганасычаных трактароў.

Цяпер паўсюль праходзіць дзяржаўны тэхнічны агляд трактароў, пагрузчыкаў і трактарных прычэпаў. Тэхагляд адбыўся ўжо ў 93 сельгасарганізацыях вобласці. Завяршыць тэхагляд аграрыі маюць намер да 11 сакавіка.

Як было заўважана падчас пасяджэння, для паспяховай пасяўной адначасова з тэхнікай найважнейшае значэнне маюць кадры механізатараў. А іх не хапае, дакладней, у гаспадарках на сёння забяспечанасць адпаведнымі кадрамі складае 94,2 працэнта ад патрэбы. Праблему вырашаюць за кошт прыцягнення людзей з іншых арганізацый. Ужо ўзгоднены 43 спецыялісты ад прамысловых прадпрыемстваў. Яшчэ 131 чалавек накіроўваецца на пасяўную з іншых відаў работ у гаспадарках. Таксама 211 выпускнікоў навучальных устаноў далі згоду працаваць на палях гэтай вясной.

Палявыя работы пачаліся не толькі ў Маларыцкім раёне. Гаспадаркі Брэстчыны прыступілі да выбарачнай падкормкі пашавых угоддзяў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ДАХОДЫ РАСТУЦЬ ХУТЧЭЙ, ЧЫМ ІНФЛЯЦЫЯ

## Рэгуляванне зразумелае, бізнес гатовы працаваць

«На працягу ўсяго 2023 года мы праводзілі серыю мерапрыемстваў па растлумачэнні норм пастановы № 713 «Аб сістэме рэгулявання цэн». У самым пачатку ўвядзення гэтай сістэмы да нас за адзін месяц паступіла больш за дзевяць тысяч зваротаў. Для бізнесу, у першую чаргу для гандлю, гэта была абсалютна новая сістэма, з якой яны не працавалі. У апошні час, нават з улікам карэкціровак, якія былі ўнесены ў сістэму рэгулявання, яна ўжо выклікае не такую значную колькасць пытанняў і тлумачэнняў. Гэта значыць, што бізнес разумее, як працаваць у новых умовах, нормы пастановы яму зразумелыя, і сістэма цэнаўтварэння таксама зразумелая», — адзначыў Іван Вежнавец.

**У мінулым годзе ўзраслі цэны на шэраг імпартных тавараў: алей аліўкавы, рыбу мароженую, цытрусавыя, бананы, вінаград, запчасткі да аўтамабіляў, рыс і іншыя. Разам з гэтым былі і тавары, па якіх адбылося істотнае зніжэнне цэн, гэта — грачаныя крупы, чай, кава, алей, бульба і гэтак далей.**

У рамках гэтай сістэмы адрэгуляваны ўвесь ланцужок руху тавараў і фарміравання цэн. «Для гандлю і імпарцёраў рэгулююцца надбаўкі з пэўнымі нюансамі для той ці іншай катэгорыі. Для вытворцаў мы ўвялі новыя падыходы з 1 студзеня, калі далі дадатковыя магчымасці ўсталёўваць цэны самастойна і павышаць іх без узгаднення з дзяржаўнымі органамі. Мы далі таксама магчымасць штомесяц на 0,3 % павялічваць цэны без узгаднення з кампетэнтнымі органамі. Па плодаагароднінай прадукцыі прадугледзелі формульнае цэнаўтварэнне для фарміравання цаны ў адносінах да аналагічнага месяца мінулага года, таму што ў плодаагароднінай прадукцыі існуе сезоннасць, ад якой нельга сысці, таму мы ўлічылі і гэтыя нюансы», — расказаў пра навацыі першы намеснік міністра.

За мінулы год па дзеянні сістэмы цэнавага рэгулявання была дасягнута ключавая задача — фарміраванне справядлівай сістэмы цэнаўтварэння, якая ўлічвае інтарэсы як насельніцтва, так і бізнесу, прадпрыемстваў. «Па выніках 2023 года пры прагнозе інфляцыі ў 7-8 % мы забяспечылі ўзровень індэкса спажывецкіх цэн на ўзроўні 5,8 %, гэта значыць нават менш запланаванага. Пры гэтым забяспечана насычанасць паліц крам як айчыннымі таварамі, так і таварамі імпартнай вытворчасці. Спажывец, нягледзячы на пэўны скепсіс, які быў у асобных колах, не заўважыў нейкіх негатыўных наступстваў ад цэнавага рэгулявання, тавару было дастаткова», — сказаў Іван Вежнавец.

## Сістэма рабочая, і змяненняў не плануецца

Дзеянне сістэмы цэнавага рэгулявання ў 2024 годзе працягнецца, падкрэсліў Іван Вежнавец. «Мы пастаянна аналізуем яе эфектыўнасць і адсочваем магчымыя негатыўныя тэндэнцыі, якія могуць выяўляцца. У нас створана спецыяльная рабочая група, якая займаецца гэтымі пытаннямі. На сённяшні момант мы не бачым нейкіх глабальных передумоў да змены сістэмы цэнавага рэгулявання альбо яе кардынальнай перабудовы. Так, магчымыя нейкія пэўныя пунктавыя карэкціроўкі, такія як летась», — адзначыў ён. Працаваць ва ўмовах выбудаванай сістэмы цэнаўтварэння магчыма, і вытворцы з гандлем да гэтага гатовыя, рэзюмаваў першы намеснік міністра.

## Рэнтабельнасць расце

Іван Вежнавец адзначыў, што гандаль за мінулы год адаптаваўся да сістэмы цэнаўтварэння і выйшаў на рост рэнтабельнасці.

«Мы штомесяц адсочвалі сітуацыю з рэнтабельнасцю. Мы бачылі, што пачатак 2023 года быў для гандлёвых суб'ектаў гаспадарання негатыўным, рэнтабельнасць па галіне ўпала да 0,4 %. І гэта быў адзін з самых нізкіх паказчыкаў за гісторыю. Былі прынятыя меры, унесеныя змены ў пастанову № 713, і да канца года мы выйшлі на рэнтабельнасць 1-1,5 %, і колькасць стратных арганізацый да канца года знізілася. Гэта значыць, што і нашы карэкціроўкі былі своечасовыя, і арганізацыі гандлю падстроіліся, — адзначыў спецыяліст. — Што датычыцца вытворцаў, то і ў іх знізілася рэнтабельнасць, але ім прасцей. Яны могуць звярнуцца ў ведамствы і мясцовыя органы ўлады, абгрунтаваць рост цэн. Узровень рэнтабельнасці — адзін з паказчыкаў, які ўлічваецца на месцах».

## Давярай, але правярай

Таксама Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю праводзіліся кантрольныя мерапрыемствы, таму што выбудоўванне сістэмы без кантролю за яе выкананнем не можа быць эфектыўным, падкрэсліў спецыяліст. «Больш за 400 суб'ектаў гаспадарання былі прыцягнутыя да адказнасці. Агульная сума штрафаў, якія былі спагнаныя работнікамі міністэрства, склала больш за 800 тысяч рублёў. Гэта ўсё таксама падахвочвае суб'ектаў гаспадарання прытрымлівацца сістэмы цэнавага рэгулявання і не дапускаць парушэнняў. Агульная колькасць парушэнняў, якая выяўлена міністэрствам, у 2023-м знізілася ў адносінах да 2022 года. Гэта таксама кажа пра тое, што бізнес і прадпрыемствы ўсё разумеюць і гатовы працаваць у гэтых умовах», — сказаў на заканчэнне Іван Вежнавец.

## Куды можна паскардзіцца на завышэнне

**Намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Андрэй ЛАБОВІЧ** расказаў пра тое, куды грамадзяне могуць паведаміць інфармацыю аб завышэнні цэн у крамах і іншых парушэннях цэнаўтварэння.

Камітэт дастаткова адкрыты з пункту гледжання атрымання інфармацыі ад спажыўцоў, адзначыў Андрэй Лабовіч. «У КДК ёсць кароткі нумар 191. Перыядычна мы праводзім тэматычныя прамыя лініі, калі грамадзяне могуць патэлефанаваць і паведаміць пра факты завышэння цэн на тавары. Летась такая тэматычная прамая лінія была па запасных частках да аўтамабіляў, па хлебабулачных вырабах, па тэме падрыхтоўкі да школьнага сезона. Наша насельніцтва досыць актыўна адгукаецца на гэтыя формы зносін. Па кожным факце камітэтам праводзяцца праверачныя мерапрыемствы і, магчыма, пацвярджаюцца парушэнні, пра якія паведамляюць грамадзяне», — расказаў ён.

Акрамя гэтага, паведаміць аб парушэннях можна на сайце камітэта праз спецыяльную панэль або ў чат-боце Telegram. «Нівodны зварот, які прыходзіць па гэтых каналах, не застаецца без разгляду», — запэўніў Андрэй Лабовіч.

## Парушэнняў становіцца значна менш

Кантроль за цэнавай сітуацыяй на спажывецкім рынку — адна з ключавых задач і кірункаў работы Камітэта дзяржаўнага кантролю, адзначыў Андрэй Лабовіч. «Калі гаварыць у лічбах аб выніках гэтай работы, то за мінулы год у 1145 суб'ектах гаспадарання былі праведзеныя праверкі і маніторынгі. Доля суб'ектаў, у якіх праводзіліся кантрольныя мерапрыемствы і выяўляліся пытанні па цэнаўтварэнні, у параўнанні з 2022 годам паменшылася. Калі летась толькі ў 12 % правераных суб'ектаў выявілі парушэнне цэнаўтварэння, то ў 2022 годзе такія парушэнні выяўляліся амаль у кожным чацвёртым», — падзяліўся лічбамі намеснік старшыні.

Акрамя пытанняў цэнаўтварэння, у асноўным выяўляюцца парушэнні правілаў гандлю, санітарных нормаў і правілаў, такія як рэалізацыя тавараў з мінулымі тэрмінамі прыдатнасці. «У каля 18 % суб'ектаў такія факты былі выяўлены. Пры выяўленні грубых парушэнняў Камітэт дзяржкантролю досыць жорстка рэагуе. У мінулым годзе работа 53 суб'ектаў гаспадарання па рашэнні камітэта прыпынена, пры гэтым у 23 суб'ектаў — за парушэнне ў цэнаўтварэнні», — расказаў ён.

**За мінулы год па дзеянні сістэмы цэнавага рэгулявання была дасягнута ключавая задача — фарміраванне справядлівай сістэмы цэнаўтварэння, якая ўлічвае інтарэсы як насельніцтва, так і бізнесу, прадпрыемстваў.**

Камітэт робіць акцэнт у сваёй працы на папярэджанне і недапушчэнне далейшых парушэнняў, у першую чаргу ў цэнаўтварэнні. «Каля 550 рэкамендацый было выдадзена суб'ектам гаспадарання. Трэба адзначыць, што ўсе на іх рэагуюць, аператыўна ліквідуюць выяўленыя парушэнні і прымаюць меры, каб такія парушэнні ў далейшым не дапускаліся», — падкрэсліў Андрэй Лабовіч.

## Спажывецкі рынак стабільны

Пра гэта паведаміла **намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Наталля ТАРАСЮК.** Паводле яе слоў, інфляцыя ў 2023 годзе склала 5,8 %, што ніжэй устаноўленага прагнознага значэння на мінулы год. «Пры гэтым зніжэнне тэмпаў росту інфляцыі летась суправаджалася ростам грашовых даходаў насельніцтва на 13,6 %, што сведчыць аб стабілізацыі сітуацыі на спажывецкім рынку краіны ў параўнанні з папярэднімі гадамі», — адзначыла яна.

У цэлым спажывецкі рынак у 2023 годзе характарызаваўся стабільнасцю. «Аб гэтым сведчаць і лічбы, і паліцы магазінаў, якія мы кожны дзень бачым у аб'ектах гандлю. Асартымент быў найшырэйшы, а тая сістэма рэгулявання, якая была ўкаранёна ў гандаль у 2022 годзе і ўзмацнілася ў мінулым, не дала «вымыцца» таварам з нашых крам. Вядома, быў і рост цэн на некаторыя тавары ў крамах», — растлумачыла Наталля Тарасюк.

У мінулым годзе ўзраслі цэны на шэраг імпартных тавараў: алей аліўкавы, рыбу мароженую, цытрусавыя, бананы, вінаград, запчасткі да аўтамабіляў, рыс і іншыя. Разам з гэтым былі і тавары, па якіх адбылося істотнае зніжэнне цэн, гэта — грачаныя крупы, чай, кава, алей, бульба і гэтак далей. Сёлета рост цэн на асноўныя спажывецкія тавары знаходзіцца ніжэй запланаваных значэнняў, заключыла намеснік старшыні.

## Купляюць беларускае

Пачатак гэтага года Наталля Тарасюк ацаніла пазітыўна. У студзені 2024 года ўзровень інфляцыі склаўся на ўзроўні 0,8 %. «Узровень інфляцыі за студзень — меншы за запланаваныя значэнні. Пазітыўным з'яўляецца і тое, што на спажывецкім рынку па вельмі многіх таварных пазіцыях узрасла доля айчынных тавараў. Тыя працэсы, якія адбываліся з улікам увядзення сістэмы цэнавага рэгулявання, заахвоцілі насельніцтва купляць больш беларускіх тавараў», — расказала яна.

Наталля Тарасюк патлумачыла, як Белстат збірае інфармацыю па індэксе спажывецкіх цэн. Ва ўлік бярэцца больш за 70 тысяч цэнавых каціровак у 31 горадзе, абследуецца 8,5 тысячы аб'ектаў — буйныя сеткі, малы і сярэдні бізнес, рынкі, індывідуальныя прадпрымальнікі і гэтак далей.

«Сёлета мы ўкаранілі некалькі навацый, якія палягчаюць нам работу і робяць якасць інфармацыі, якая збіраецца, яшчэ больш дакладнай, — адзначыла Наталля Тарасюк. — Мы выкарыстоўваем звесткі АІС СККА, інфармацыю, сабраную з дапамогай касавых падсумавальных апаратаў Міністэрства па падатках і зборах. Мы ўжо працуем з гэтай сістэмай па пяці найбуйнейшых аб'ектах Мінска. Аналіз сітуацыі на спажывецкім рынку і тых лічбаў, якія атрымліваем з дапамогай збору рэгістратарамі і па касавых падсумавальных апаратах, сведчаць аб дакладнасці работы нашых супрацоўнікаў. Акрамя таго, укаранілі ў практыку вэб-скрэйпінг. У некаторых невялікіх гарадах можа не быць пэўнага тавару. Аднак мы разумеем, што жыхары гэтага населенага пункта маюць магчымасць набыць такія тавары праз інтэрнэт. Напрыклад, заказаць матацыкл на сайце «Мотавела». Таму з дапамогай вэб-скрэйпінга далучаем падобныя каціроўкі».

Наталля Тарасюк заявіла, што «сістэма па статыстычным уліку індэкса спажывецкіх цэн выбудаваная, інфляцыя ў нашай краіне падлічана дакладна, і тыя меры, якія прыняты ўрадам у рамках пастановы № 713, эфектыўныя».

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Навіны сталіцы

# Не любое касавае абсталяванне ўсім гандлярам падыдзе

## Аб новаўвядзеннях у выкарыстанні касавага абсталявання з першых дзён ліпеня гэтага года

**Сталічная падатковая інспекцыя нагадвае ўсім суб'ектам гаспадарання, што ўстаноўлены новыя патрабаванні да касавага абсталявання. Калі касавае абсталяванне, якое выкарыстоўваецца ў цяперашні час, не можа быць дапрацавана да адпаведнасці новым патрабаванням, то суб'ектам гаспадарання неабходна набыць новую мадыфікацыю касавага апарата альбо новую мадэль праграмнай касы, якія адпавядаюць новым патрабаванням.**

Пэўным плацельшчыкам падаткаў неабходна загадзя пачаць работу па абнаўленні касавага абсталявання, якое выкарыстоўваецца ў гандлёвых аб'ектах. «Асаблівую ўвагу на неабходнасць абнаўлення касавага абсталявання рэкамендую звярнуць суб'ектам гаспадарання, якія ажыццяўляюць рэалізацыю тавараў, што падлягаюць маркіроўцы сродкамі ідэнтыфікацыі і ўніфікаванымі кантрольнымі знакамі», — адзначыла **намеснік начальніка інспекцыі МПЗ па горадзе Мінску Вольга ТАРАСЕВІЧ.**

Важна! Пералікі тавараў, якія падлягаюць вышэйзгаданай маркіроўцы, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29.07.2011 г. № 1030 «Аб таварах, якія падлягаюць маркіроўцы».

Так, для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія рэалізоўваюць такія тавары, уводзіцца абавязак выкарыстоўваць касавыя апараты і праграмныя касы, якія забяспечваюць дыферэнцыраваны ўлік даных аб рэалізацыі тавараў; счытванне кода маркіроўкі і ўнікальнай паслядоўнасці знакаў у машыначытальнай форме і перадачу інфармацыі пра іх у сістэму кантролю касавага абсталявання. На афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах nalog.gov.by ў раздзеле «Інспекцыя МПЗ па горадзе Мінску» можна знайсці больш падрабязную інфармацыю.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Прафесіяналы

# СУВЯЗЬ — ІХ ЛЁС І ЖЫЦЦЁ

**У РУП «Белтэлекам» працуе шмат таленавітых, добрасумленных, творчых, старанных людзей, якімі ганарацца філіялы і структурныя падраздзяленні кампаніі. Так, і з боку дзяржавы дзейнасці працоўнага калектыву даецца станоўчая ацэнка, а найлепшыя супрацоўнікі атрымліваюць дзяржаўныя ўзнагароды.**

Нядаўна ў калектыў кампаніі прыйшла прыемная вестка. **Начальнік Мядзельскага ўчастка электрасувязі Маладзечанскага ЗУЭС Мінскага філіяла РУП «Белтэлекам» Анатоль МАЛЬКО** і **інжынер электрасувязі станцыйнай групы Докшыцкага ўчастка электрасувязі Глыбоцкага ЗУЭС Віцебскага філіяла РУП «Белтэлекам» Аляксандр ГЛІНСКІ** ўзнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі». Мы вырашылі бліжэй пазнаёміцца з гэтымі людзьмі.



Аляксандр ГЛІНСКІ.

— Сумненняў наконт будучай прафесіі ў мяне не было ніколі, бо яшчэ ў юнацтве я цвёрда вырашыў пайсці па слядах свайго бацькі, які ўсё жыццё працаваў у галіне сувязі, — расказвае Аляксандр Глінскі. — Скончыўшы каледж, я пачаў працоўную дзейнасць электраманцёрам па электраабсталяванні пятага разраду, потым працаваў электрамеханікам электрасувязі ў сваім родным Докшыцкім раёне. Прайшоў службу ва Узброеных Сілах. Атрымаў вышэйшую адукацыю ў Віцебскім філіяле УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі», цяпер працую інжынерам электрасувязі Докшыцкага раённага вузла сувязі.

Аляксандр Ягоравіч адзначае, што яго прафесія інжынера вельмі творчая. «Да нас штогод паступае новае абсталяванне, якое патрабуе ад спецыялістаў творчага падыходу. Новая тэхніка, праграмнае забеспячэнне патрабуюць ад выкарыстоўваць усе іх вялікія магчымасці. А для гэтага часам прыходзіцца шукаць нестандартныя рашэнні», — гаворыць наш герой.

І тут жа дзякуе ўсяму калектыву Докшыцкага раённага вузла сувязі, у якім працуе шмат добрых кваліфікаваных людзей. Трыццаць гадоў таму яго — маладога спецыяліста — у ім цёпла сустрэлі, дапамаглі дасканала асвоіць усе нюансы прафесіі. Сёння ён ужо сам рыхтуе маладую змену і робіць гэта з задавальненнем.

У вольны ад работы час Аляксандр Глінскі займаецца спортам. «Адкрыю сакрэт: у свой час у мяне была магчымасць стаць прафесійным спартсменам, але ў гэтым кірунку крыху не пашанцавала, — прызнаецца ён. — Тым не менш спортам усё жыццё я займаюся вельмі актыўна. Напрыклад, нядаўна на працягу трох выхадных дзён запар я сем разоў выходзіў на старт лыжных гонак. Летам займаюся трэйланінгам (бегам па бездарожжы), лыжаролерамі, веславаннем на байдарках і турызмам навогул. У маёй калекцыі, дарэчы, налічваецца некалькі соцень спартыўных узнагарод».

З гонарам Аляксандр Ягоравіч адзначае, што сямейная дынастыя сувязістаў працягваецца. Яго сын таксама працуе ў сістэме электрасувязі, праўда, у Мінску. Спецыялістам сэрвіснага цэнтра РУП «Белтэлекам» працуе і жонка нашага героя.

— Яшчэ ў юнацтве я захапляўся радыёаматарствам, магчыма, гэта і вызначыла мой выбар, — расказвае пра тое, як выбраў прафесію сувязіста Анатоль Малько. — Пасля заканчэння вайсковай службы ў 1984 годзе я паступіў на падрыхтоўчае аддзяленне Мінскага радыётэхнічнага інстытута, дзе і атрымаў вышэйшую адукацыю. Ну, а працаваць паехаў у свой родны Мядзельскі раён, вырашыў жыць па прынцыпе «дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся». У Мядзелі я пачаў свой працоўны шлях электрамеханікам на мясцовым вузле сувязі, прайшоў усе прыступкі прафесійнага росту, а ў 2010 годзе ўзначаліў Мядзельскі ўчастак электрасувязі Маладзечанскага ЗУЭС Мінскага філіяла РУП «Белтэлекам».

Многае змянілася з таго часу, калі Анатоль Аляксеевіч прыйшоў у працоўны калектыў. «Як памятаю, тады ў нас на ўчастку працавала 120 чалавек, а цяпер — усяго 34. Што датычыцца абсталявання, то яно змянілася кардынальным чынам. Папершае, стала куды больш кампактным, а яго тэхнічныя магчымасці несуразмерныя ў параўнанні з тым, што было ў канцы 1980-х гадоў. Ды і віды паслуг, якія мы сёння аказваем спажыўцам, — куды больш разнастайныя», — з гонарам гаворыць ён.



Анатоль МАЛЬКО.

Сёння ўдасканаленне абсталявання ідзе хуткімі тэмпамі. І задача сучасных спецыялістаў — апаратыўна яго асвойваць, каб найлепшым чынам выкарыстоўваць яго шырокія магчымасці. «У нашым працоўным калектыве з гэтым праблем няма, — адзначае Анатоль Малько. — Людзі вопытныя, умелыя, высокакваліфікаваныя. Сярэдні ўзрост спецыялістаў складае 40–50 гадоў. Я ганаруся тым, што мне даводзіцца кіраваць такім выдатным працоўным калектывам. Па выніках 2022 года Мядзельскі ўчастак электрасувязі Маладзечанскага ЗУЭС Мінскага філіяла РУП «Белтэлекам» прызнаны найлепшым у Мінскай вобласці і найлепшым у краіне. Дарэчы, летась мы зноў занялі першае месца на Міншчыне і чацвёртае месца ў Беларусі. Сёння мы ўкараняем новыя віды паслуг, такія, напрыклад, як відэакантроль, лакальна-вылічальныя сеткі, мабільны праект «Мой горад». Адным словам, ідзём у нагу з часам».

Анатоль Аляксеевіч лічыць сябе шчаслівым чалавекам і ганарыцца, што прысвяціў усё жыццё «Белтэлекаму». Дарэчы, і тут сямейная дынастыя: на прадпрыемстве працуе ўся яго сям'я — жонка Валянціна, сын Аляксей і дачка Марына.

Да таго ж гэта не першая ўзнагарода ў скарбонцы Анатоля Малько. Яго прафесіяналізм і адданасць працы былі адзначаны раней, што пацвярджаецца перамогай у намінацыі «Найлепшы кіраўнік», атрыманнем нагруднага знака «Ганаровы работнік сувязі Беларусі» і занясеннем у Кнігу пашаны РУП «Белтэлекам».

**Сяргей РУЧАНАЎ.**
**Фота з архіва РУП «Белтэлекам».**

# РАБОТАДАВЕЦ ЕДЗЕ Ў... АРМІЮ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Галіна сельскай гаспадаркі ніколі не была лёгкай, але прэстыж гэтых прафесій з кожным годам павышаецца. Гэтаму папярэднічаюць будаўніцтва сучасных комплексаў, высокая заработная плата, добрыя сацпакеты. У мінулым годзе ў сельскагаспадарчыя арганізацыі паўночнага рэгіёна прыбылі 172 выпускнікі з вышэйшай і 189 выпускнікоў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Палову з іх забяспечылі жыллём, а для запатрабаваных кваліфікаваных кадраў з 2020 года пабудавалі 25 індывідуальных дамоў сядзібнага тыпу ў Верхнядзвінскім, Віцебскім і Аршанскім раёнах. Узровень замацавання спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй павялічыўся да 54 працэнтаў, на высокім узроўні замацаванне мэтавікоў пасля адпрацоўкі — больш за 60 працэнтаў. Важную ролю ў жаданні маладзі заставацца ў арганізацыях адыгрываюць розныя стымуляцыйныя выплаты.

Адным з прадпрыемстваў вобласці, дзе праводзіцца вялікая работа з маладымі спецыялістамі, з'яўляецца Аршанскі мясакансервавы камбінат. Летась на працу ў гэты флагман харчовай прамысловасці Віцебшчыны прыняты 13 спецыялістаў, чатыры з якіх былі звольнены ў сувязі са службай у арміі. Для юнакоў камбіната гэта незабыўная падзея, бо з 2022 года кіраўніцтва прадпрыемства ўвяло традыцыю ўрачыста выпраўляць хлопцаў у рады Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Мерапрыемства праводзіцца на тэрыторыі камбіната каля помніка Герою Савецкага Саюза Мікалаю Карначонку, навабранцам уручаюць памятныя падарункі, жадаюць мірнай і спакойнай службы і зазначаюць, што чакаюць іх вяртання ў працоўны калектыў.

У кастрычніку мінулага года ўрачыстыя провады прайшлі для чатырох абвальшчыкаў мяса сыравіннага аддзялення цэха забою і перапрацоўкі свіней і буйной рагатай жывёлы. Дарэчы, на камбінат маладыя людзі прыйшлі з адной групы Аршанскага дзяржаўнага каледжа харчавання па размеркаванні. З лёгкай рукі абкама прафсаюза работнікаў АПК да аднаго з іх у войска лютаўскім днём прыехалі ганаровыя госці.





19-гадовы Даніла Ахвярдзіеў праходзіць тэрміновую службу ў радыётэхнічных войсках пад Паставамі. Напрыканцы лета хлопец прыйшоў на Аршанскі МКК у якасці абвальшчыка мяса, прычым абраў сельскагаспадарчую прафесію самастойна і стаў першым у сям'і, хто пайшоў па гэтай нялёгкай сцежцы. Але са справай Даніла быў знаёмы, яшчэ падчас навучання праходзіў практыку на камбінаце. Там з дапамогай старэйшых калег асвоіў усе этапы апрацоўкі мяса, натрэніраваўся фізічна. «Абрыўшы працу на прадпрыемстве, я ні разу не пашкадаваў. Хоць давялося пабыць у прафесіі нядоўга, задаволены і заработнай платай для маладога спецыяліста, і ўмовамі, і адносінамі з боку кіраўніцтва», — расказвае юнак.

Умовы і сапраўды добрыя: здзельна-прэміяльная сваечасовая зарплата (некаторым удаецца атрымліваць пад дзве тысячы рублёў), трэнажорная зала, грашовыя падарункі на дні нараджэння і юбілеі, прадуктовыя наборы асабістай прадукцыі камбіната да свят. У жыллі Даніла не мае патрэбы: ён карэнны аршанец, але астатнім камбінат выдзяляе і гэта. «Мы з бацькам перасцерагалі сына: работа фізічна цяжкая, цэлы дзень на нагах. Але ўпартасць і імкненне да лепшага перамаглі, за гэты час Даніла змог сябе зарэкамендаваць. Так перажывала, калі прыйшла павестка ў армію, але, зразумеўшы, у якіх умовах будзе сын паўтара года, стала спакайней», — расказвае маці хлопца Тацццяна Яўгенаўна.

У войску Даніла служыць вадзіцелем. Ён адзін з нямногіх саслужыўцаў, хто змог авалодаць «УАЗікам». Цяпер у дзень даводзіцца праязджаць па 400 кіламетраў, але гэта, расказвае Ахвярдзіеў, прыносіць яму задавальненне. Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны ён з трапяткімі пачуццямі чакаў гасцей. Павіншаваць маладога чалавека са святам прыехалі **старшыня Віцебскай абласной прафсаюзнай арганізацыі работнікаў АПК Тацццяна ДЗІКАНАВА, старшыня прафкама Аршанскага мясакансервавага камбіната Тацццяна МАХРОВА** і маці Тацццяна. Госці прывезлі імянны торт, прадукцыю камбіната, памятныя падарункі, стварыўшы святочны настрой для ўсяго аддзялення.

«Маладыя спецыялісты, якія прыходзяць у сельскагаспадарчыя арганізацыі паўночнага рэгіёна, — гэта наш надзейны тыл. І для нас вельмі важна стварыць для іх усе неабходныя ўмовы з мэтай замацавання і прафесійнага росту. Перадаючы напрацаваны вопыт і тэхналогіі маладому пакаленню, мы будуем моцны падмурак для ўстойлівага развіцця і росквіту нашай краіны», — падкрэсліла Тацццяна Дзіканава і ўручыла падарунак Данілу. Словы падзякі за выхаванне сына і кветкі прафсаюзны лідар аграрыяў вобласці адрасавала маці юнака Тацццяне Яўгенаўне.

За сталом, які атрымаўся ўтульным і сямейным, малады чалавек дзяліўся сваімі армейскімі справамі і расказваў пра планы на будучыню. А яны ў маладога спецыяліста канкрэтныя — вярнуцца на камбінат. «А мы вас там абавязкова чакаем. Адказным і старанным людзям у нас заўсёды знойдзецца месца», — адзначыла Тацццяна Махрова. Яна перадала хлопцу віншаванні і памятны падарунак ад генеральнага дырэктара АМКК Максіма Бакурава.

Сціпла, але з вялікай радасцю ў вачах Даніла дзеліцца: ніколі не думаў, што прадпрыемства можа так клапаціцца аб сваіх работніках. «Вы не паверыце, вельмі прыемна. Я і саслужыўцам расказаў, яны па-добраму пазайздросцілі. У такія моманты за сотні кіламетраў ад роднага дому адчуваеш сябе патрэбным і важным для камбіната», — рэзюмуе юнак.

Па словах Тацццяны Дзіканавай, такая ініцыятыва абласной прафсаюзнай арганізацыі работнікаў АПК стане добрай традыцыяй у рэгіёне. «Маладыя спецыялісты павінны нават у адрыве ад працоўнага працэсу адчуваць сябе членам калектыву. А мы будзем імкнуцца зрабіць для гэтага ўсё магчымае», — паабяцала яна.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**

Перажытае — незабытае

# Мая Радзіма — Беларусь

**«Пра многіх кажуць «дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся», але ж гэта, дзякуй богу, не пра мяне», — прызнаўся неяк былы дырэктар унітарнага прадпрыемства «Гомельводпраект» Павел Рыгоравіч Абрамчук і расказаў, што на белы свет з'явіўся 14 мая 1945 года ў нямецкім горадзе Вальфсбург, а вось рос, вучыўся і працаваў ужо ў Беларусі. Тут яго Радзіма.**

Але ж усё па парадку.

— Нашу сям'ю, — расказваў Павел Рыгоравіч, — бацькоў, бабулю Варвару, дзядулю Фядоса, малога браціка ў 1943 годзе прымусова вывезлі ў Германію. Тых пакут і прыніжэнняў, што перанеслі дарослыя, я, вядома ж, не зведаў. Але добра запомніў расповеды бацькоў аб тым, як яны ад цямна да цямна ў полі і на ферме працавалі на баўэра Роберта Гаўзэ, як жылі ў невялікім пакойчыку, які знаходзіўся над свінарнікам, як кармілі іх абы чым, таму вязні часта хварэлі...

Толькі ў верасні 1945-га Абрамчукі вярнуліся на радзіму, на... папялішча свайго дома. Жылі ў суседзяў і знаёмых. Маці, каб пракарміць сям'ю, хадзіла па вёсках батрачыць, а то і жабраваць. Толькі потым бацька навучыўся складваць печы, стаў зарабляць і сям'я змагла пабудаваць жытло, дапамагчы дзецям атрымаць адукацыю.

Павел скончыў сямігадовую, а потым сярэднюю школу, якія знаходзіліся ў розных вёсках, куды дабіраўся на сваіх дваіх ці на веласіпедзе. Потым паступіў у Пінскі гідрамеліярацыйны тэхнікум, пасля яго заканчэння атрымаў дыплом з адзнакай, па размеркаванні прыехаў у Гомельскую даследчую экспедыцыю інстытута «Белгіправодгас» (пазней — «Гомельводпраект»).

Затым была служба ў войску, вучоба на завочным аддзяленні Беларускай сельгасакадэміі. Ганаровы меліяратар Павел Абрамчук больш за паўвека працаваў на адным і тым жа прадпрыемстве («Гомельводпраект»): яго ж цягам некалькіх гадоў паспяхова ўзначальваў.

...У 2003-м у складзе адной з дэлегацый ён наведаў Германію. Немцы сустрэлі беларусаў добра, ім, як выглядала, было сорамна за тое, што нацысцкая Германія развязала вайну, што так бязлітасна эксплуатавала вязняў.

Паўлу Рыгоравічу з пэўнымі цяжкасцямі ўдалося трапіць у тую самую сям'ю, на якую, не разгінаючыся, калі можна так сказаць, працавалі яго бацькі.

Гаспадароў ён, вядома ж, не заспеў. Удалося ўбачыць хіба нявестку. Яе муж ваяваў на Усходнім фронце, быў паранены, пасля вайны памёр.

Сама жанчына сустрэла гасцей насцярожана, а то і разгублена. Ва ўсякім разе падарункі з Беларусі прыняла, але нечым пачаставаць (хоць бы кубкам гарбаты) не палічыла магчымым.

...А Павел Рыгоравіч без справы не застаўся і на заслужаным адпачынку: ён намеснік старшыні Гомельскай гарадской грамадскай арганізацыі «Дзеці вайны». Дзякуючы яе праектам (каардынатар — міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Узаемаразуменне» пры падтрымцы нямецкага фонду «Памяць, адказнасць, будучае») удаецца шмат што зрабіць для паляпшэння якасці жыцця пажылых людзей, дзяцінства ў якіх забрала вайна.

— Мая Радзіма — Беларусь, я ганаруся ёй, — яшчэ раз падкрэслівае Павел Рыгоравіч. — І я хачу, каб нашы людзі ніколі не зведалі таго, што давялося перажыць нашым бацькам і дзядам.

**Уладзімір Пернікаў,**
*г. Гомель.*

Свет захапленняў

# «Ветрык» — хор аматарскі. І ўзорны...

**Музыка — чараўніцтва, цуд, які гучыць, калі нам радасна і бесклапотна, калі мы ў роспачы і смутку... Мы любім слухаць добрыя песні і кампазіцыі, марыць пад прыгожыя мелодыі... І толькі той, хто хоць паспрабаваў спасцігнуць асновы музычнага майстэрства, ведае, якой вялікай працы патрабуе гэтае чараўніцтва! З чаго яна, гэтая праца, пачынаецца? Ну, вядома ж, з першага ўрока, які нехта можа атрымаць дома, альбо...**

Ірына Іванаўна Мілічэнка — настаўніца спеваў сталічнай дзіцячай школы мастацтваў № 1, кіраўнік узорнага аматарскага хору «Ветрык», які часта выступае на розных мерапрыемствах, на гарадскіх і рэспубліканскіх канцэртах. Не так даўно ў складзе хораў сталіцы выступаў, напрыклад, у Палацы Рэспублікі на ўручэнні прэмій Прэзідэнта ў галіне культуры і мастацтва.

У рэпертуары «Ветрыку» — творы самых розных жанраў, стыляў і эпох: ад Баха да сучаснасці. Асаблівае месца займае музыка беларускіх кампазітараў. Часам здаецца амаль нерэальным, што такія складаныя і дарослыя творы выконваюць дзеці! У чым, бясспрэчна, вялікая заслуга кіраўніка калектыву...



«Ветрык» перад канцэртам у Палацы Рэспублікі.

Свае першыя крокі ў музыцы Ірына Мілічэнка ўспамінае з вялікім цяплом і любоўю, бо яе настаўнікам быў тата — ваенны дырыжор... «Я спявала з дзяцінства, — кажа Ірына Іванаўна, — і неяк мой голас пачуў заслужаны артыст Беларусі Барыс Іпалітавіч Райскі. Ён жа прапанаваў паўдзельнічаць у здымках на тэлебачанні, выступіць з аркестрам...»



Кіраўнік хору Ірына Іванаўна МІЛІЧЭНКА з актыўнай удзельніцай Дар'яй СТЭЛЬМАХ рыхтуюцца да выступлення на радыё.

Пасля ў жыцці спявачкі быў каледж мастацтваў імя Ахрэмчыка і любімая выкладчыца Галіна Рыгораўна Цітова, вучоба ва Універсітэце культуры, дзе ад многіх цудоўных педагогаў студэнтцы хацелася браць нешта свае... І — абавязкова — у тым ліку любоў да прафесіі.

...Ірына Іванаўна, вядома ж, разумее, што не ўсе ўдзельнікі хору, выпускнікі школы пойдуць следам — зробяць музыку сваёй прафесіяй. Але ж заняткі мастацтвам пашыраць іх кругагляд, узбагацяць душу. Да таго ж зносіны з аднагодкамі, цікавыя мерапрыемствы, паездкі — гэта яшчэ і сябры, з якімі можна ісці па жыцці далей.

**Таццяна Плюшчай,**
*г. Мінск.*

Чалавек — чалавеку

# Я НА ПОТЫМ АДКЛАДВАЎ ЦЁПЛЫЯ СЛОВЫ,

## спадзяваўся, што сказаць іх яшчэ паспею...

**Ну вось — нарэшце! — прычакалі вясны! Не ведаю, як у іншых, а ў мяне яна пачынаецца не толькі з жаночага свята, але і з балючых, светлых успамінаў, бо раней 8-га Сакавіка мы ўсёй сям'ёй віншавалі маму, матулю, бабулю з днём яе нараджэння.**

...Гартаю сямейны альбом, пераглядваю фотаздымкі. На асобных мама маладзейшая, на многіх старэйшая і старэнькая, але ўсюды прыгожая.

Маленства яе прайшло на хутары Камісараўшчына.

Мы неаднойчы бывалі там, збіралі грыбы, вішні, маліны, слухалі маміны расказы пра дзядзьку Яна (той сваімі рукамі рабіў музычныя інструменты (і шмат на чым іграў), цудоўную мэблю, шыў адзенне і вопратку), пра будаўніцтва царквы на пагорку ля вёскі Сарокі...

Мама ўзгадвала, як у гэтым храме спявала ў царкоўным хоры, як перад святамі разам з іншымі дзяўчатамі і жанкамі хадзілі туды на прыборку, як вянкамі ўпрыгожвалі іконы...

Мама вельмі любіла кветкі і не шкадавала свайго часу на догляд.

Цяпер гэта раблю я: саджу яе любімыя вяргіні, гляджу, як растуць ды цвітуць, і заўжды ўспамінаю...

Рана асірацеўшы, мама шмат працавала — спачатку на сваёй зямлі, потым на калгаснай, жыла сумленна сама і нас так вучыла жыць. Аднойчы ў краме ў Глыбокім касір аблічылася — рэшты дала ёй больш, чым належала.

Мама згледзела гэта толькі на аўтастанцыі, калі купляла білет на аўтобус, і пасля гэтага ў вёску, дамоў не паехала: вярнулася назад у краму, аддала там лішнія грошы...

Яна заўсёды мала думала пра сябе, — увесь час клапацілася пра іншых. Калі з'явіліся ўнукі, першае пытанне было: «Як яны? Каб хоць жа здаровенькія!»

...Думаю цяпер: ці разумеем мы, ці шануем сваіх бацькоў?

У памяці ўсё часцей і часцей усплываюць эпізоды, калі мама нешта хацела падказаць, параіць, а я лічыў, што сам — разумны ж! — магу ва ўсім разабрацца, і — замест таго, каб выслухаць яе ды падзякаваць, прытуліць да сябе — адмахваўся, спяшаўся па справах, вельмі шмат што адкладваў на потым.

...Апошнія месяцы, дні і хвіліны я правёў з ёй побач: паспеў яшчэ даць ёй свечку ў рукі, а вось галоўных і, магчыма, вельмі патрэбных слоў так і не сказаў — не паспеў.

**І. Букоўскі,**
*Глыбоцкі раён.*

Смех смехам

# Хто працуе, той святкуе

**Мая бабуля расказвала, як цяжка жылося вяскоўцам у гады вайны ды пасля яе: падаткі з людзей спаганялі, за работу грошай не плацілі. У калгасе налічвалі хіба так званыя працадні, на якія ў канцы года і ў залежнасці ад ураджаю маглі выдаць бульбы ці збожжа.**

Але ж бабуліны дзеці яшчэ не галадалі, бо дзед Платон нейкім чынам трымаў пчальнік, быў добрым краўцом і шаўцом. Дзякуючы гэтым дадатковым заробкам ён самым першым, напрыклад, змог прыдбаць сабе новыя зубы (здымны пратэз) і потым хваліцца, якая ж гэта выгода!

Вяскоўцаў, праўда, больш цікавіла цана: хто-ніхто нават спецыяльна прыходзіў да дзеда ў хату — прасіў паказаць, за што можна было ўляпіць столькі грошай?!

— А ты сам паглядзі, — неяк з печы буркнуў гаспадар аднаму з цікаўных. — Вунь там, на паліцы ляжаць.

...Мужчына потым хацеў з некім падзяліцца, расказаць, што бачыў Платонаву абнову, але ж вёска яго не слухала: лічыла, што зубы на паліцу можа пакласці хто заўгодна, але не пчаляр, не чалавек з галавой і рукамі.

А яно ж і сапраўды... Ці не так?

**В. Адамчык,**
*г. Мінск.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
28 лютага 2024 г. № 8 (741)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



# З увагай да кожнай праблемы

## З якімі пытаннямі грамадзяне звярталіся да Наталлі КАЧАНАВАЙ падчас прамой тэлефоннай лініі

**У пятніцу, 23 лютага, Старшыня Савета Рэспублікі адказвала на званкі жыхароў многіх рэгіёнаў краіны. Людзі заўважалі, што, прайшоўшы многія інстанцыі і не знайшоўшы дапамогі, вырашылі звязацца са спікерам верхняй палаты парламента. Наталля Іванаўна ўважліва выслухала кожнага, удакладніла, якая канкрэтная дапамога патрабуецца, і дала шэраг даручэнняў кампетэнтным асобам.**



Фота БелТА.

### Патрэба ў квадратных метрах, нядобрасумленны забудоўшчык і падман

Жыллёвае пытанне на працягу многіх гадоў знаходзіцца ў топе зваротаў насельніцтва да вышэйшых службовых асоб. Не выключэннем стала і прамая тэлефонная лінія, якую праводзіла спікер верхняй палаты парламента. Дзве сям'і мінчан паскардзіліся на тое, што ніяк не могуць атрымаць ад забудоўшчыка дакументы, якія ўстанаўліваюць правы на ўласнасць. Пенсіянеры з Чашніцкага раёна і з Кобрына цікавіліся магчымасцю прыватызацыі арэнднага жылля.

Жыллёвае пытанне ніяк не вырашаецца і ў сям'і ваеннаслужачых, якая пераехала ў сталіцу сем гадоў таму. Сужэнцы і іх трое дзяцей вымушаны туліцца ў здымнай малагабарытнай двухпакаёўцы. «А дзеці растуць, становіцца ўсё складаней», — падзялілася Вольга Валер'еўна.

Старшыня Савета Рэпублікі заўважыла, што апошнім часам для ваеннаслужачых будуецца шмат жылля, таму яна не разумее, у чым праблема, што дадзенай сям'і не прапануюць кватэру. З сітуацыяй, як запэўніла спікер, разбяруцца найбліжэйшым часам.

Дапамогі ў паляпшэнні жыллёвых умоў папрасіла і жыхарка Касцюковіч Магілёўскай вобласці. Тацціяна Мікалаеўна паведаміла, што разам з мужам і трыма дзецьмі яна жыве ў інтэрнаце. Старэйшае дзіця — інвалід першай групы. Паколькі інвалід дзяцінства стаў паўналетнім, сям'ю знялі з чаргі тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Са сваім пытаннем яна ўжо звярталася ў мясцовыя органы ўлады, але атрымала адмоўны адказ. Пры гэтым, як падкрэсліла Тацццяна Мікалаеўна, яе сям'я будзе рада і арэнднаму жыллю. Наталля Качанава паабяцала, што кампетэнтным асобам будзе даручана разабрацца, ці можна дапамагчы сям'і ў рамках дзеючага заканадаўства.

Святлана Іванаўна з Баранавіч расказала, што яна, як шматдзетная маці, стаяла на чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У 2022 годзе сям'я атрымала ўчастак пад будаўніцтва жылога дома, якое ім пракрэдытавалі. Аднак сталічны забудоўшчык, з якім жанчына заключыла дагавор, не выканаў свае абавязацельствы ў поўнай меры і ўвогуле, са слоў Святланы Іванаўны, павёў сябе нядобрасумленна. У выніку сям'я не мае магчымасці працягваць будаўніцтва.

«Трэба ўважліва вывучыць дагавор, які вы падпісалі, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. — Паспрабуем выйсці на забудоўшчыка, каб з ім пагутарыць». Пытанне ўзята на кантроль.

Сваёй жыллёвай праблемай са спікерам падзялілася і Тацццяна Мікалаеўна. Жанчына разам з сям'ёй жыве ў Мінску. Не так даўно сужэнцы набылі закінутую хату ў Слуцку. «У мяне бацька там пахаваны, таму купілі хату, каб часцей наведваць яго магілу», — патлумачыла жанчына. Аднак з-за гэтай уласнасці, якую ў выніку прызналі жылой, хоць жыць там, па яе словах, увогуле немагчыма, сям'ю знялі з чаргі тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Акрамя таго, не могуць яны разлічваць і на дзяржаўную дапамогу ў выглядзе субсідыі.

«Атрымліваецца, я набыла закінутую хату за тысячу беларускіх рублёў, а мяне пазбавілі 65 тысяч беларускіх рублёў субсідыі, — патлумачыла Тацццяна Мікалаеўна. — Мяне проста падманулі, бо сказалі, што закінутае жыллё не паўплывае на будаўніцтва. А цяпер мы гэтую хату прадаць не можам, бо ў такім стане яна нікому не патрэбная».

Наталля Качанава паабяцала разабрацца ў гэтым пытанні «Галоўнае — не хвалюйцеся», — дадала яна.

### Прага парадку на зямлі і паважлівага стаўлення да дзіцяці

Людміла Іосіфаўна з аграгарадка Крэва Смаргонскага раёна падзялілася сваёй безвыходнай сітуацыяй, як жанчына лічыць. «На працягу пяці гадоў займаюся гэтым пытаннем, магчыма, вы дапаможаце яго вырашыць», — з надзеяй звярнулася яна да Старшыні Савета Рэспублікі.

Жанчына расказала, што побач з яе зямельным участкам знаходзіцца суседскі — закінуты. Грамадзянка паведаміла, што яе сям'я хоча прывесці гэты ўчастак у парадак, тым больш ён не патрэбны яго гаспадыні. Апошняя не супраць прадаць сваю зямлю, але зрабіць гэтага не можа, бо па дакументах уласнікам участка з'яўляецца яе муж, які, па словах заяўніцы, жыве не ў Беларусі.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

---





## Удзел у памятных мерапрыемствах і сустрэчы з калектывамі

### Якім быў мінулы тыдзень сенатараў

● У Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня Барысаўскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Алена ЗЯБЛІКАВА** прыняла ўдзел ва ўскладанні кветак да помніка «Ахвярам фашызму». «Гэтае свята — свята мужнасці, стойкасці, доблесці, адвагі, цвёрдасці духу, — падкрэсліла сенатар. — Ва ўсе часы воіны Узброеных Сіл самааддана абаранялі бацькоўскую хату ад ворага. Не шкадавалі сябе ў цяжкую гадзіну, ішлі ў бой, падымалі краіну з руін. Сёння мы жывём у незалежнай, свабоднай краіне. Наша павага да вас, абаронцы Айчыны, бязмерная. Выконваючы свой воінскі абавязак, вы сапраўды служыце роднай Беларусі, умацоўваючы яе суверэнітэт».

● **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Жабінкаўскага раённага Савета дэпутатаў Анатоль ШАЛТАНЮК** узяў удзел у мітынгу, прысвечаным Дню абаронцаў Айчыны, які адбыўся каля брацкай магілы савецкіх воінаў і партызан. Прадстаўнікі працоўных калектываў арганізацый і прадпрыемстваў раёна і сілавога блока хвілінай маўчання ўшанавалі памяць тых, хто змагаўся за наша мірнае неба. У знак глыбокай павагі да манумента ўсклалі кветкі. Удзельнікі мітынгу далучыліся да міжраённага аўтапрабегу, прымеркаванага да адзінага дня галасавання «Мы за будучыню разам». Калона з некалькіх дзясяткаў аўтамабіляў з горада-спадарожніка пад беларускімі сцягамі адправілася па памятных мясцінах Жабінкаўскага раёна. Памятныя мясціны алічбоўваюцца ў рамках рэспубліканскага праекта «Захаваем гісторыю». Так, падчас першага прыпынку — на краі аграгарадка Сцяпанкі, каля брацкай магілы, дзе пахаваны ахвяры страшнай трагедыі ў вёсцы Драмлёва, таблічку з QR-кодам адкрылі лідары грамадскіх аб'яднанняў. Каля падножжа помніка землякам у аграгарадку Хмелева парламентарый сумесна з намеснікам старшыні Жабінкаўскага райвыканкама Інай Тарасевіч урачыста адкрылі таблічку з QR-кодам.

● **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Саўгаскамбінат «Зара» Алег СЛІНЬКО** правёў сустрэчу з працоўным калектывам узначаленага ім прадпрыемства. Разгледжаны вынікі гаспадарчай дзейнасці саўгаскамбіната за 2023 год, намечаны планы на перспектыву. «Калектыў прадпрыемства сёння — адна каманда, адзіны, зладжаны механізм, настроены на выкананне пастаўленых задач, — адзначыў парламентарый. — Уклад кожнага ў агульную справу надзвычай важны. Наперадзе шмат планаў, шмат мэт, і ў нас ёсць усё, каб іх выканаць: стабільнасць, згуртаванасць, дысцыпліна і майстэрства». Сенатар падзякаваў супрацоўнікам за годныя вынікі, добрасумленную працу, прафесіяналізм, пажадаў здароўя, міру, новых працоўных поспехаў, уручыў ганаровыя граматы і каштоўныя падарункі.

● **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 13 г. Мінска» Марына ІЛЬІНА** напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь уручыла прыпісныя пасведчанні грамадзянам Фрунзенскага раёна г. Мінска, якія будуць прызывацца на воінскую службу. Парламентарый падкрэсліла важнае новаўвядзенне новай Ваеннай дактрыны — адэкватнасць мер, якія прымаюцца дзяржавай, у адпаведнасці з узроўнем ваеннай небяспекі. «Наша задача — захаваць і зберагчы мір у Беларусі, каб наш народ мог працягваць спакойна працаваць і гадаваць дзяцей, — адзначыла Марыша Ільіна. — Беларусь — міралюбівая краіна, якая нікому не пагражае».

**Вераніка КАНЮТА.**

# З увагай да кожнай праблемы

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

«Дайце свае каардынаты, мы разбяромся», — папрасіла Наталля Качанава. Яна вітае ініцыятыву Людмілы Іосіфаўны, якая хоча навесці парадак на зямлі. «Вы маеце рацыю: нельга, каб гэты ўчастак быў закінуты», — пацвердзіла спікер.

Надзея Уладзіміраўна з Мазыра паведаміла, што яе дачка была на прыёме ў Наталлі Іванаўны ў верасні.

«Я яе памятаю, — заўважыла Старшыня Савета Рэспублікі. — Пытанне датычылася здароўя хлопчыка?»

«Так», — пацвердзіла жанчына.

«Калі праблема застаецца, на вас выйдзе асабіста міністр аховы здароўя», — паабяцала спікер і ўдакладніла, ці ёсць да яе яшчэ пытанні.

Надзея Уладзіміраўна паведаміла, што ў сувязі з дыягназам яе ўнука адчуваецца негатыўнае стаўленне да хлопчыка з боку выхавацеляў дзіцячага садка. Наталля Качанава сказала, што дасць даручэнне — і па гэтым пытанні ў райцэнтр выедуць спецыялісты, дзе комплексна разбяруцца ў сітуацыі.

## З клопатам аб жывёлах і справядліва да людзей

На прамую тэлефонную лінію звярнулася і жыхарка Брэста Ірына Мікалаеўна, якая прадставілася дырэктарам зоаабаронччай арганізацыі. Жанчына з'яўляецца членам рабочай групы па распрацоўцы законапраекта «Аб адказным абыходжанні з жывёламі», які ўжо ў першым чытанні разгледжаны ў Палаце прадстаўнікоў і абмеркаваны на экспертным савеце пры Савеце Рэспублікі. Заяўніцу хвалюе пытанне з рэгістрацыяй жывёл. Па яе меркаванні, гэты момант вельмі важны ў пытанні прафілактыкі шаленства. Акрамя таго, рэгістрацыя жывёл, як заўважыла Ірына Мікалаеўна, станоўча паўплывала б на сітуацыю жорсткага абыходжання з гадаванцамі.

Наталля Іванаўна ўважліва выслухала заяўніцу і, нягледзячы на тое, што абмеркаванне законапраекта на экспертным савеце ўжо адбылося, паабяцала яшчэ раз вярнуцца да гэтага пытання.

Мінчанка паскардзілася на функцыянаванне пастановы Савета Міністраў № 22 «Аб прызнанні дзяцей тымі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы». Па меркаванні Анастасіі Станіславаўны, гэты дакумент стаў не толькі сродкам уплыву на нядобрасумленных бацькоў, а ў пэўных выпадках — сродкам ціску. Жанчына расказала, што яе з мужам без падстаў абвінавачваюць у неналежным выхаванні дзяцей. У сувязі з гэтым супрацоўнікі органаў унутраных спраў і сферы адукацыі праводзяць сацыяльнае расследаванне. Заяўніца прывяла канкрэтныя прыклады, якія абурылі Старшыню Савета Рэспублікі.

Спікер дапускае, што пэўныя перагібы могуць быць, але яна нагадала і іншыя выпадкі, калі з-за недастатковай увагі кампетэнтных органаў да канкрэтных сем'яў здараюцца трагедыі. Адна з апошніх адбылася ў Оршы, калі, па папярэдняй версіі следства, маці забіла сваіх чатырох дзяцей.

Адразу пасля прамой тэлефоннай лініі Наталля Качанава сустрэлася з начальнікам ГУУС Мінгарвыканкама Міхаілам Грыбам і старшынёй камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Андрэем Стрыгельскім, якім даручана комплексна разабрацца ў гэтым пытанні.

**Вераніка КАНЮТА.**

ЗНАЁМСТВА

# «Ёсць жаданне пакінуць пасля сябе добры, выразны след»

## Спыталі ў выбраных дэпутатаў мясцовых Саветаў пра планы на адказнай пасадзе

***Людміла МАРОЗ, дырэктар Столінскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, выбрана дэпутатам Столінскага раённага Савета.***

— У сваёй дэпутацкай рабоце маю намер акцэнтаваць увагу прадстаўнічага органа ўлады на пытаннях падтрымкі сям'і, асабліва сям'і шматдзетнай, а таксама ўразлівых катэгорый насельніцтва — састарэлых, адзінокіх сталых людзей, інвалідаў. Гэтай работай займаюся па родзе дзейнасці, але ж, бывае, узнікаюць пытанні, праблемы, якія патрабуюць вырашэння на больш высокім узроўні, — гаворыць Людміла Васільеўна. — Скажам, наш цэнтр шмат гадоў працуе на папулярызацыю ідэі шматдзетнай сям'і. Мы афармілі свае напрацоўкі, аб'ядналі іх у праект пад назвай «З сям'і пачынаецца Радзіма». І бачым, што комплексны, міжведамасны падыход дае станоўчыя вынікі: за апошнія гады колькасць шматдзетных сем'яў у раёне істотна вырасла. Відавочна, што работу трэба працягваць, і пад эгідай раённага Савета яна можа атрымаць новы імпульс.

А для выбаршчыкаў Усходняй акругі № 1, якія аказалі мне давер, мяркую стаць дэпутатам, які зможа данесці да органаў улады іх праблемы і запыты, а таксама аператыўна праінфармаваць, падказаць, растлумачыць.

* * *

***Пётр КОРКУЦ са жніўня мінулага года выконваў абавязкі старшыні Валаўскага сельскага выканаўчага камітэта Ельскага раёна.***

***Пётр Коркуц абраны дэпутатам Валаўскага сельскага Савета дэпутатаў і Ельскага раённага Савета дэпутатаў па Валаўскай выбарчай акрузе № 22. Пётр Міхайлавіч шчыра ўдзячны сваім землякам за давер і падтрымку.***

У аграгарадку Валаўск Пётр Міхайлавіч нарадзіўся і вырас. Пасля службы ў арміі і вучобы ў педінстытуце ён вярнуўся ў родны населены пункт і больш чым трыццаць гадоў прапрацаваў настаўнікам у мясцовай сярэдняй школе.

— Лічу прыярытэтным кірункам дзейнасці дэпутата аказанне дапамогі ў вырашэнні надзённых праблем, якія хвалююць людзей, — гаворыць ён. — Таксама для народнага выбранніка важна папулярызаваць здаровы лад жыцця, занятkі спортам, спрыяць выхаванню сапраўдных патрыётаў сваёй краіны, захоўваць нацыянальныя традыцыі, сцвярджаць агульначалавечыя маральныя і хрысціянскія каштоўнасці. Упэўнены, што толькі пры падтрымцы землякоў можна ўсяго гэтага дабіцца. Разам мы зможам зрабіць наш раён яшчэ больш добраўпарадкаваным, а жыццё — лепшым. Спадзяюся, што назапашаны жыццёвы досвед і досвед працоўнай дзейнасці дапамогуць мне паспяхова вырашаць задачы, якія стаяць перад Ельскім раёнам, і адстойваць інтарэсы сваіх землякоў.

* * *

***Сяргей УЛАСЕНКАЎ узначальвае ў Мсціславе раённы аддзел па НС.***

***Кажа, што па службе яго задача № 1 — абараняць людзей. І гэта вельмі сугучна абавязкам дэпутата, якія ён будзе выконваць у раённым Савеце.***

Роля народнага выбранніка для яго новая, але пра дэпутацкую дзейнасць ведае не па чутках. І рэалізоўваць ініцыятывы разам з мясцовымі ўладамі таксама даводзілася неаднойчы. Найбольш значны праект — аднаўленне Пажарнай каланчы, дзе цяпер размешчаны музей пажарнай справы. З людзьмі і раней пастаянна прыходзілася шчыльна працаваў. І што хвалюе гараджан, ведае добра. Сам жыве ў горадзе ўжо на працягу 14 гадоў.

— Можна лічыць, што праблемы народныя і мае асабістыя — агульныя, — кажа суразмоўнік. — У найбліжэйшых планах — вырашыць пытанні па рамонце дарог па вуліцах Куйбышава, Маладзёжнай і добраўпарадкаванні тратуараў па вуліцы Пятра Мсціслаўца, якая злучае вуліцы Маладзёжную і Куляшова. На гэта часцей за ўсё людзі звярталі ўвагу падчас нашых сустрэч. Праблемы самыя вострыя і набалелыя. Для вырашэння іх буду рабіць усё магчымае, што ад мяне залежыць. Адказнасць вельмі вялікая. На тэрыторыі маёй выбарчай акругі «Куйбышаўская» знаходзяцца сярэдняя школа № 2 і гімназія, дзе ў агульнай колькасці вучацца болей за 1200 чалавек, тут жа размешчаны два дзіцячыя садкі, 95 прыватных дамоў, інтэрнат і гэтак далей. Шмат хто ў горадзе ведае мяне асабіста, шмат каго ведаю я. Мне здаецца, што разам у нас усё атрымаецца. Мне падабаецца мой горад і мая краіна. І ёсць жаданне пакінуць пасля сябе добры, выразны след.

* * *

***Дзяніс СЫРАМАХА, дырэктар Гродзенскага філіяла адной з кампаній мабільнай сувязі, разам з 30 народнымі выбраннікамі будзе ў складзе прадстаўнічай улады горада Гродна ў будучым, 29-м, скліканні.***

***Дарэчы, нядаўняя электаральная кампанія стала для яго другой.***

Рашэнне балатавацца было прынята не спантанна, гэта грунтоўна абдуманы крок. Ён разумеў, што можа зрабіць яшчэ больш для горада і яго жыхароў. Было і хваляванне, бо за дэпутацкі мандат давялося паспаборнічаць — на яго ўчастку, як, дарэчы, і на ўсіх іншых, выбары былі альтэрнатыўнымі. Тым не менш выбаршчыкі аказалі давер чалавеку, якога ведаюць.

Як і ў папярэдні перыяд дэпутацкай дзейнасці, Дзяніс Сырамаха мяркуе кіравацца інтарэсамі і воляй тых людзей, якія прагаласавалі за яго кандыдатуру. Важным, на яго погляд, аспектам, стане наладжванне канструктыўнага ўзаемадзеяння з органамі ўлады. Такія кантакты, па яго словах, садзейнічаюць усебаковаму развіццю горада.

Дзяніс Віктаравіч прызнаецца, што ён чалавек нераўнадушны і гатовы адстойваць інтарэсы гродзенцаў на высокім узроўні. На яго думку, варта накіраваць свае намаганні на ўзаемадзеянне з моладдзю. Гэта падтрымка маладзёжных ініцыятыў, раскрыццё творчага і навуковага патэнцыялу маладых людзей, прыцягванне іх да вырашэння сацыяльна-эканамічных задач горада.

Маладзёжнае асяроддзе — не адзінае, куды варта прыкласці намаганні, лічыць дэпутат гарсавета. На яго думку, варта аказваць падтрымку і сацыяльна неабароненым людзям.

Вынікам работы дэпутата з'яўляюцца яго канкрэтныя справы. Дзяніс Віктаравіч расказаў, што за мінулы тэрмін работы звярталася ўвага на звароты грамадзян, у тым ліку на тыя, што датычацца добраўпарадкавання. Сумесна з гарадскімі службамі ўдалося вырашыць шэраг праблем па ўстаноўцы кантэйнераў для смецця, ажыццявіць ямачны рамонт двароў, рамонт дахаў, пад'ездаў, дабраўпарадкаваць дзіцячыя пляцоўкі, прыпынкі грамадскага транспарту, пляцоўкі для выгулу сабак, вырашыць шэраг іншых пытанняў.

Дарэчы, дарожнай тэме ў горадзе сёлета будзе надавацца важнае значэнне. Гарадскі бюджэт прадугледжвае даволі значныя выдаткі на паляпшэнне дарог. Дэпутат таксама плануе актыўна ўключыцца ў гэту работу ў інтарэсах сваіх выбаршчыкаў.

**Апытанне правялі нашы карэспандэнты ў рэгіёнах: Нэлі ЗІГУЛЯ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Маргарыта УШКЕВІЧ і Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЯК ЗНАЙСЦІ ГРОШЫ НА РАЗВІЦЦЁ

## У Магілёве ўзнагародзілі ініцыятыўных дэпутатаў і іх памочнікаў

**Сам факт падвядзення вынікаў штогадовага спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання — паказчык таго, што супрацоўніцтва паміж жыхарамі і дэпутатамі можа быць вельмі плённым.**
**На мерапрыемства запрашаюцца практыкі, якія дакладна ведаюць, што трэба, каб жыццё на вёсцы не прыпынялася.**
**А віншаванні і ўзнагароды, якія ім уручаюць, добры стымул для таго, каб лягчэй працавалася і хутчэй рэалізоўвалася запланаванае.**

### Ад Вечнага агню да вясковай базы адпачынку

Сярод сельсаветаў пальма пяршынства на гэты раз у Ходасаўскага сельсавета Мсціслаўскага раёна. Ён адзначаны пераходным сцягам, дыпломам I ступені і грашовай прэміяй у памеры 500 базавых велічынь. Дарэчы, летась сельсавет таксама быў узнагароджаны — дыпломам III ступені па выніках работы за 2022 год. У аграгарадку з'явіўся Вечны агонь, каля якога па пятніцах, а таксама на Дзень Перамогі і іншыя памятныя даты, нясуць вахту памяці ходасаўскія школьнікі. Мемарыял «Агонь памяці» быў створаны ў аграгарадку па ініцыятыве дэпутатаў.

У працэсе стварэння Алея Герояў — у гонар заслужаных землякоў. На ёй ужо ўстаноўлены памятны знак удзельніку Вялікай Айчыннай вайны, партызану, заслужанаму педагогу Сяргею Ксянзову. Гэта па яго ініцыятыве ў Ходасах была пабудавана новая школа, якую ён і ўзначальваў да свайго выхаду на пенсію. Сёлета на Алеі з'явілася гранітная кампазіцыя ў гонар яшчэ аднаго знакамітага земляка — Героя Савецкага Саюза, генерал-маёра танкавых войскаў Філіпа Мікітавіча Рудкіна.

— Гэты праект атрымалася рэалізаваць дзякуючы суфінансаванню нашых вяскоўцаў, — адзначыў **старшыня сельсавета Анатоль ПРУДНІКАЎ**. — Толькі на адзін помнік герою пайшло каля 2 тысяч рублёў. А там створана цэлая кампазіцыя. Добрыя людзі дапамаглі прывезці тракі ад танка Т-34. Спонсары выдзелілі грошы на пастамент, які ўяўляе сабой танкавую вежу.

У аграгарадку жыве 1600 чалавек. Мабільная каманда, якая перыядычна актывізуе насельніцтва на добрыя справы, складае каля 30 чалавек. Адзін са значных праектаў «Гараць ярка агні парку» быў рэалізаваны разам з Магілёўскай абласной Асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў. Было ўстаноўлена 10 светлавых апор, і за сродкі Асацыяцыі набытыя святлодыёдныя сонечныя батарэі. Шмат што атрымалася ўвасобіць у жыццё за грошы, якія ўручаліся за перамогі ў тых ці іншых конкурсах. Напрыклад, у парку Дружбы ўстаноўлена варкаўт-пляцоўка, абсталяванне для якой набытае за грошы прэміі па выніках работы за 2020 год. А сёлетнюю прэмію сельсавет плануе накіраваць на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы і добраўпарадкаванне населеных пунктаў. Ёсць задумка стварыць у аграгарадку Плошчу Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга.

Другое месца, дыплом і 400 базавых велічынь атрымаў на развіццё Семукацкі сельсавет Магілёўскага раёна. Гэты сельсавет паказвае найлепшыя па краіне вынікі работы з Указам № 116. Летась у гаспадарчы абарот было ўведзена 49 дамоў на тэрыторыі сельсавета. А вынік: 31 прададзены дом — найлепшы па краіне! Летась тут быў рэалізаваны ўнікальны праект па стварэнні архітэктурна-этнаграфічнага комплексу «Мая Бацькаўшчына».



Перавезена ў цэнтр аграгарадка аўтэнтычная 1946 года пабудовы школа і цалкам адноўлены побыт сярэдзіны мінулага стагоддзя.

— Прэмію патрацім на гаспадарчыя патрэбы, — адзначыла **старшыня сельсавета Тамара УКРУЖСКАЯ**. — Напрыклад, набудзем кустарэз для работы на тэрыторыі. Плануем таксама ў вёсцы Вялікія Бялевічы абнавіць помнік землякам, якія абаранялі нашу краіну ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Трэцяе месца і адпаведна 300 базавых велічынь прысуджана Лапаціцкаму сельсавету Слаўгарадскага раёна. Установа вельмі плённа працуе з насельніцтвам, разам добраўпарадкоўваюцца месцы адпачынку, памятныя зоны. Мінулы год у Слаўгарадскім раёне праходзіў пад знакам 80-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтай тэме былі прысвечаны дзве ініцыятывы ў вёсцы Рабавічы — па добраўпарадкаванні месца воінскай славы «Партызанская вёска» і стварэнні Алеі пераемнасці пакаленняў. А яшчэ Лапаціцкі сельсавет набывае папулярнасць як цікавае месца адпачынку для дзяцей. Стараста вёскі Пацяраеўка Фёдар Бондараў стварыў непадалёк ад яе базу адпачынку «Маленькія дзівы» і зараз рэалізуе шыкоўную ініцыятыву «Захавай прыроду!». Разам з дзецьмі ён здзяйсняе цікавыя вандроўкі і развівае экалагічны турызм.

— У нас шмат актыўных жыхароў, разам мы робім наш край прыгажэйшым, — кажа **старшыня Лапаціцкага сельсавета Сяргей АНТОШКІН**. — А прэмія нам дапаможа ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу сельсавета. Вельмі патрэбныя камп'ютар для работы, прынтар.

### Моцныя разам

Добра, калі актывіст у сельскай мясцовасці не адзін і ў яго ёсць група падтрымкі. Сярод калегіяльных органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання зноў лідзіруе Мсціслаўскі раён — на гэты раз аграгарадок Сялец. Старшыня КОТГС Святлана Іванова атрымала пераходны вымпел і прыз у памеры 50 базавых велічынь. Калегіяльны орган тут самы малады, існуе ўсяго два гады.

— А ўсё пачалося з жадання жыхароў мець дзіцячую пляцоўку, — удакладняе **старшыня Мсціслаўскага райсавета Алена КЛЕЯНКОВА**. — Праўда, насельніцтва чакала, што ім яе падораць. Прыйшлося папрацаваць з людзьмі, каб пераканаць, што яны таксама не павінны заставацца ў баку. Стварылі спачатку ініцыятыву, прыцягнулі спонсараў, атрымалі дапамогу ад абласной Асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, і ўсё атрымалася. Жыхары зразумелі, што могуць самастойна вырашаць пытанні і стварылі калегіяльны орган. Цяпер іх нават і падштурхоўваць не трэба. Самі бяруць ініцыятыву ў рукі і дзейнічаюць.

Другое месца з грашовым падарункам у памеры 40 базавых у вулічнага камітэта № 1 Савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання мікразоны № 10 Кастрычніцкага раёна Магілёва. **Старшыня камітэта Кацярына ВАСІЛЬЕВА** лічыць, што такая высокая ацэнка — стымул для таго, каб рухацца далей.

— Мы бачым, як прыгажэе наш горад, як ён добраўпарадкоўваецца і пераўтвараецца, і бярэм прыклад, — адзначае яна. — Якасны ўзровень жыцця залежыць ад кожнага з нас. Мы рэалізуем некалькі ініцыятыў, накіраваных на падтрымку ветэранаў, якія жывуць на нашай вуліцы, і далучаем да сваёй дзейнасці моладзь. Цяпер працуем над праектам па захаванні памяці пра тых герояў, нашадкі якіх жывуць на нашай вуліцы. Ён будзе называцца «Лёс маёй сям'і ў гісторыі вайны».

Трэцяе месца і 30 базавых велічынь уручана старшыні мікразоны № 2 «Савецкая» ў Крычаве — Таццяне Бабровай.

### Айда ў Цяхцін на Масленіцу

Жыць весела не забароніш. Але павінен быць завадатар або завадатарка. У аграгарадку Цяхцін Бялыніцкага раёна такая ёсць — мясцовая **староста, загадчыца бібліятэкі Людміла УСАВА**. Ёй уручаны пераходны вымпел і прэмія ў памеры 30 базавых велічынь.

— Асноўная мая работа — работа з насельніцтвам, — кажа яна. — Усім, хто да мяне звяртаецца, я па меры магчымасці дапамагаю. Людзі бачаць, што я сама раблю, і падключаюцца. Найбольш актыўныя — жыхары сярэдняга ўзросту. Летась яны звярнуліся з ініцыятывай па будаўніцтве дзіцячай пляцоўкі, і сёлета будзем яе будаваць. Нас падтрымалі на конкурсе ініцыятыў, і ўжо ў ліпені ў нас будзе дзіцячая пляцоўка.

Людміла Усава нарадзілася ў гэтай тады яшчэ вёсцы, і для яе тут усё важна. Працавала спачатку бібліятэкаркай, цяпер — загадчыца. А для аднавяскоўцаў яшчэ і прыклад для пераймання. Летась арганізавала некалькі суботнікаў, ініцыявала добраўпарадкаванне грамадскіх могілак. Яна рэжысёр усіх мясцовых народных мерапрыемстваў і ўжо рыхтуецца весела адзначыць з землякамі Масленіцу. Цяхцінцы таксама з яе падачы адзначаюць Свята бярозавага соку.

— Праводзім шмат мерапрыемстваў, запрашаем моладзь, пенсіянераў. У нашым будынку — школа мастацтваў, якую наведваюць дзеці, — удакладняе яна.

На другім месцы ў асабістым заліку — старшая па доме № 7 па вуліцы Цэнтральнай у аграгарадку Каменка Чавускага раёна Праскоўя Сафронава. Як неабыякавы да сваёй малой радзімы чалавек яна арганізавала работы па адраджэнні мясцовай славутасці — Пятроўскай крынічкі. Мабілізавала насельніцтва на збор сродкаў і выкананне работ па добраўпарадкаванні на гэтым месцы. Тут была зроблена купель, абноўленыя прыступкі да крынічкі. Цяпер гэты аб'ект знаходзіцца пад яе асабістай аховай, яна клапоціцца пра парадак на ім. Разам з дыпломам II ступені жанчына атрымала грашовую прэмію ў памеры 15 базавых велічынь.

У старасты вёскі Восава Бабруйскага раёна Віктара Саўко дыплом III ступені і грашовае заахвочванне ў памеры 15 базавых велічынь. Вясковая дзятва ведае яго яшчэ як выдатнага Дзеда Мароза, які на Новы год разносіць па дамах падарункі і нават удзельнічае ў Бабруйску ў парадзе Дзедаў Марозаў. Больш актыўнага старасту яшчэ трэба пашукаць. Ён прымае ўдзел ва ўсіх грамадскіх справах. Летась, напрыклад, дзякуючы яму ў Восава да радасці дзяцей і іх бацькоў з'явілася дзіцячая пляцоўка.

Адзначана таксама плённая работа Паўлавіцкага сельсавета Кіраўскага раёна, Палыкавіцкага сельсавета Магілёўскага раёна і савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання № 1 мікразоны № 2 «Кіраўская» Слаўгарада, аграгарадка Старое Радча Круглянскага раёна. А сярод актывістаў выказана ўдзячнасць у адрас старасты аграгарадка Падсолтава Мсціслаўскага раёна Святланы Макароўскай, старасты аграгарадка Семукачы і вёскі Хімніца Магілёўскага раёна Валянціны Цыкуновай.

* * *

**Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК** адзначае высокую ролю органаў грамадскага самакіравання ў рашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва.

— Дэпутацкі корпус актыўна супрацоўнічае з мясцовымі органамі самакіравання, у складзе якіх прадстаўнікі сельсаветаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання — і калегіяльныя, і аднаасобныя. Праз іх мы трымаем сувязь з насельніцтвам, маем зваротную сувязь, ведаем і разумеем праблемныя пытанні, якія трэба вырашаць. Узаемадзейнічаючы з органамі выканаўчай улады, сумесна вырашаем пытанні, якія паступаюць ад насельніцтва. У перыяд работы дэпутатаў 28-га склікання з насельніцтвам праведзена вялікая работа па рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў. Вельмі важна, што з мінулага года ў рамках змянення Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» вызначаны парадак рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў. Стала прасцей вырашаць пытанні па падтрымцы актыўных грамадзян, якім не ўсё роўна, як выглядае населены пункт, дваравая тэрыторыя, дзе яны жывуць. На сёлетні конкурс грамадзянскіх ініцыятыў паступіла 57 праектаў, з якіх 30 прынялі ўдзел у конкурсе. Пераможцы атрымалі фінансаванне на рэалізацыю праекта. Перакanana, што і далей дэпутацкі корпус будзе плённа працаваць разам з насельніцтвам на карысць нашага рэгіёна і краіны ў цэлым.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва суразмоўнікаў.**

СВАЕ СЯРОД СВАІХ

# ШТО МОЖА СТАРАСТА ВЁСКІ?

## Разважанні на канкрэтных прыкладах

**Звычайна на пачатку года ў раёнах праходзяць сходы стараст, якія арганізуюць райсаветы. На гэтых невялікіх форумах падводзяць вынікі работы, абагульняюць вопыт самых лепшых, уручаюць прэміі і каштоўныя падарункі. Асабліва актыўных стараст заахвочваюць таксама па выніках абласных аглядаў. Цяпер, калі мяняецца састаў дэпутатаў сельскіх Саветаў, важна захаваць гэты актыў.**

### Дзеля памяці, для нашчадкаў

Некаторыя сапраўды працуюць цікава, як цяпер кажуць, крэатыўна. У асобных ёсць свае «фішкі», ёсць справы, да якіх яны здолелі прыцягнуць аднавяскоўцаў. Сёння гаворка менавіта пра такіх.

І першы ў гэтым шэрагу — Пётр Іосіфавіч Навумчык. Ён быў старастай вёскі Буса Іванаўскага раёна шмат гадоў. Той самай шматпакутнай Бусы, жыццё якой перамянілася ў лістападзе 1957 года, калі на пажары загінулі 65 чалавек, у большасці дзяцей і падлеткаў. Там загарэлася школа падчас кінасеанса. І за лічаныя хвіліны юнацтва і надзея вёскі пайшлі ў вечнасць па недарэчнай выпадковасці. Пётр Навумчык страціў на тым пажары бацьку і сястру, яму было тады 12 гадоў.

У вёсцы, вядома, жыла памяць пра трагедыю. Але ж змянілася пакаленне, маладыя з'ехалі ў горад, стаў прыходзіць у заняпад стары помнік. У канцы 90-х гадоў Пятра Навумчыка выбіраюць старастай, і ён пачынае літаральна бударажыць грамадскасць наконт устаноўкі новага помніка. Пётр Іосіфавіч ідзе ва ўстановы і арганізацыі, наведвае заможных прадпрымальнікаў, расказвае пра наступствы пажару, і многія людзі адгукаюцца. Паступова збіраюцца грошы, і ў 2002 годзе ў Бусе адкрываюць новы помнік з прозвішчамі на мармуровай пліце, з адпаведным добраўпарадкаваннем тэрыторыі. З таго часу ў гадавіну трагедыі ў вёсцы з падтрымкай райвыканкама праводзяць жалобныя мерапрыемствы.



Помнік франтавікам Бусы.

Але староста не спыняецца на дасягнутым. Ён узнімае грамаду, і паступова з'яўляецца помнік землякам, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай, і тым, якія ваявалі. На пліце, прымацаванай да валуна, змешчаны два спісы. Адзін пад назвай «Яны загінулі за Радзіму», другі — «Яны змагаліся за Радзіму». Такім чынам увекавечылі памяць усіх франтавікоў-землякоў. Потым узяліся за помнікі невядомым воінам і партызанам, якія з даўняй пары былі на вясковых могілках. Іх таксама абнавілі, прывялі ў парадак. Вядома, актыўнаму старасце заўсёды аказваў падтрымку райвыканкам, раённы Савет, памагала мясцовае сельгаспрадпрыемства. Але ж ільвіную долю работы ён браў на сябе. Як і цяпер, даглядаць помнікі Пятру Навумчыку дапамагаюць яго дзеці і ўнукі. А калі па стане здароўя ён не змог выконваць абавязкі старасты, эстафету падхапіла жонка Ганна Андрэеўна...

Адной з галоўных сваіх спраў староста вёскі Задуб'е Ганцавіцкага раёна Ірына Валасюк лічыць збор і абагульненне звестак пра гісторыю населенага пункта, найперш пра ваенныя гады. Ірына Барысаўна — бібліятэкар, ваенная тэмай цікавілася даўно. А калі ў Задуб'і закрылі школу, то ўсе матэрыялы, якія беражліва захоўвалі настаўнікі-краязнаўцы, перадалі ў бібліятэку. Да іх Ірына Валасюк дадала газетныя выразкі, што збірала шмат гадоў, уласныя нататкі. Ірына Барысаўна паспела апытаць і запісаць успаміны нешматлікіх ветэранаў вайны, а таксама відавочцаў падзей таго часу. Задуб'е — вёска асаблівая, карнікі палілі яе два разы: першы раз у канцы 1943 года, другі — у пачатку 1944-га. За два разы знішчылі 149 хат, забілі 48 чалавек.

Два гады таму пачалі ўзводзіць новы памятны знак на месцы трагедыі вёскі, рыхтаваліся памятныя мерапрыемствы, і вельмі спатрэбіліся матэрыялы, сабраныя старастай. Цяпер яна занятая клопатамі па захаванні гістарычнай памяці пра вёску, пераводзіць сабраныя матэрыялы з паперы ў лічбу.



Пётр НАВУМЧЫК каля помніка ахвярам пажару.

### У сямейнай камандзе

За гады работы не раз даводзілася сустракацца з актыўнымі старастамі. І заўважала, што часцей за ўсё тыя з іх паспяховыя, хто працуе ў сямейнай камандзе, то-бок у каго муж альбо жонка становіцца першым памочнікам, як і ў выпадку з Пятром і Ганнай Навумчыкамі. У Камянецкім раёне ёсць староста Ванда Раслякова. Ванда Паўлаўна ў вёсцы Галоўчыцы на гэтай грамадскай пасадзе без малога сорак гадоў. Як высветлілася, давер ёй аказалі землякі яшчэ з савецкага часу. З той пары яна нязменны вясковы лідар. Але з яе расказу пра справы апошніх гадоў вынікала, што асноўны груз работы нярэдка бярэ на сябе муж Аляксей Міхайлавіч. Летась, напрыклад, калі прыбіралі старыя аварыйныя дрэвы, ён некалькі тыдняў шчыраваў разам з работнікамі дарожных службаў, уласнымі механічнымі прыстасаваннямі вывозіў галлё і дробныя драўляныя адходы. У яго ёсць веласіпед з маторам, які выручае з мабільнасцю, калі трэба аб'ехаць аднавяскоўцаў альбо тэрмінова наведацца ў сельсавет.

У Кобрынскім раёне адзін са старастаў на тэрыторыі Дзівінскага сельсавета расказаў мне, як жонка вядзе ўлік спраў у вялікіх сшытках-журналах. Там запісваюцца грошы, якія ахвяруюць людзі на агульныя клопаты, напрыклад, добраўпарадкаванне могілак. Занатоўваецца кожная капейка, як у графе «прыход», так і ў раздзеле «расход». Таму любы ахвотны можна заўсёды правесці рэвізію і атрымаць падрабязную справаздачу. А яшчэ жонка старасты запісвае, у каго юбілеі, круглыя даты, у сшытку ёсць інфармацыя пра ўдзельнікаў вайны і кавалераў дзяржаўных узнагарод, нават тых, каго даўно няма ў жывых. «Усё можа спатрэбіцца на свята вёскі, яшчэ на якія мерапрыемствы. Важна, каб было пад рукой», — гаварыла жонка старасты.



Ванда і Аляксей РАСЛЯКОВЫ.

### Дарога для вёскі

Ёсць нямала старастаў, якія ўмеюць і любяць ствараць прыгажосць. Такіх як Любоў Гугнюк, староста вёскі Клепачы Пружанскага раёна. Да выхаду на пенсію Любоў Мікалаеўна ўзначальвала мясцовы ўчастак камунальнай гаспадаркі. Тое, што было яе прафесіяй, цяпер стала яе хобі. На пасадзе старасты яна мабілізавала аднадумцаў, у асноўным з асяродку равесніц. Пачынаючы з вясны жанчыны высаджваюць кветкі, упрыгожваюць вуліцы роднага пасёлка. Шмат чаго зрабіла для прыгажосці вёскі Падкраічы Бярозаўскага раёна яе староста Раіса Чапайла. Нават прэмію, якую атрымала за перамогу ў абласным спаборніцтве, яна патраціла на грамадскія патрэбы. І такіх старастаў можна знайсці ў кожным раёне.

Старшыня Веляміцкага сельскага Савета Святлана Пашкевіч нядаўна расказала мне пра старасту вёскі Старына Столінскага раёна, па ініцыятыве якога ўзвялі дарогу паміж двума населенымі пунктамі. Дакладней, зрабілі з камянёў бруканку. Іван Ільіч Слуцкі цяпер пенсіянер, з канца 90-х ён быў старастай у Старыне на працягу 15 гадоў. Дык вось яго і выбралі старастай пасля таго, як ён узняў грамаду і ўзначаліў работу па будаўніцтве дарогі. Старына — вёска асаблівая, яна ўзнікла ў сярэдзіне 60-х, лічы, на роўным месцы, калі звезлі былыя хутары. Не было ў вёсцы ні школы, ні магазіна, ні ФАПа, ні клуба, ні бібліятэкі. Па ўсё трэба было хадзіць у Велямічы. А навакол лясы, балоты, дарога ж — адны слёзы. Іван Ільіч тады калгасным брыгадзірам працаваў. Папрасіў старшыню калгаса дапамагчы пераадолець бездарожжа. Калгасная тэхнікай прывозілі камень з Мікашэвіч. А мясцовыя жыхары, мабілізаваныя Слуцкім, разбівалі тыя камяні на дробныя кавалкі, каб потым можна было брукаваць дарогу. Калгас яшчэ і будаўнічую брыгаду выдзеліў. Так пракладвалі тую дарогу працяглацю ў шэсць з паловай кіламетраў усе разам некалькі тыдняў. І цяпер ёй карыстаюцца. Праўда, летась зверху насыпалі гравій. А ў наступным годзе запланавана асфальтаванне дарогі. Але Івану Ільічу да гэтай пары аднавяскоўцы ўдзячныя за добрую справу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.985. Нумар падпісаны ў 19.30 27 лютага 2024 года.**

# ЗДЗЯЙСНЕННІ І ПЛАНЫ...

## Айчыннае кнігавыданне паўстагоддзя таму

**Часам сухія дакладныя запіскі, якія пільна захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, падаюцца даволі красамоўнымі справаздачамі пра шырокую, неабсяжную супольную працу і творчай грамадскасці, і органаў дзяржаўнага, на той час, час даўно мінулых дзесяцігоддзяў, рэспубліканскага кіравання...**

У лютым 1968 года сакратарыят Саюза пісьменнікаў Беларусі звярнуўся да Першага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Пятра Міронавіча Машэрава і старшыні Савета Міністраў БССР Ціхана Якаўлевіча Кісялёва з даволі прэтэнзійнай і разам з тым, відавочна, шмат у чым абгрунтаванай запіскай. Пра градус напружвання тэмы сведчаць наступныя словы (пад імі падпісаліся Максім Танк, Янка Брыль, Іван Мележ, Пімен Панчанка, Мікола Ткачоў, Іван Шамякін, Аляксей Кулакоўскі): *«За апошнія дзесяць гадоў у адносінах выдавецтва з пісьменнікамі адбыліся змены, якія парушылі ранейшыя, нармальныя ўзаемадачыненні паміж пісьменнікамі і выдавецтвамі. Змены гэтыя адбыліся пад націскам фінансавых органаў рэспублікі і з'яўляюцца аднабаковымі, выгаднымі толькі адной старане — выдавецтву, несправядлівымі ў адносінах да пісьменнікаў.*

*Гэтыя пытанні неадноўчы ўздымаліся пісьменнікамі на розных сходах, і мы лічым сваім абавязкам паставіць іх перад ЦК Кампартыі Беларусі і Саветам Міністраў БССР...»*

**Зазірніце сёння ў букіністычныя аддзелы сучасных кнігарняў ці ў інтэрнэт-крамы па продажы старых кніг, і вы знойдзеце нямала назваў кніг гэтай аўтарытэтнай серыі. Відавочна, што і цяпер да зборнікаў, выдадзеных пад «брэндам» «Бібліятэка беларускай прозы», звяртаюцца і чытачы новых пакаленняў, і даследчыкі беларускай літаратуры.**

Што ж было на самай справе?.. Якой была кніжная, кнігавыдавецкая рэчаіснасць на самай справе?.. Звернемся да адной пазіцыі, бо за ёю — лічбы і факты. Па прычыне звароту літаратараў у ЦК і ва ўрад старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку Рыгор Канавалаў са сваімі падначаленымі падрыхтаваў даволі падрабязную даведку... Звернемся да яе, каб паспрабаваць прасвятліць пытанне, агучанае аўтарытэтнымі пісьменнікамі, кіраўніцтвам Саюза пісьменнікаў (сярод аўтараў звароту — шэсць прадстаўнікоў сакратарыята Саюза і сакратар партыйнай арганізацыі грамадскага творчага аб'яднання).

*«Творы беларускіх пісьменнікаў у сённяшні час выпускаюцца ў асноўным выдавецтвамі «Беларусь» і «Народная асвета»* (нагадаем, што не было яшчэ тады ні «Мастацкай літаратуры», ні «Юнацтва», ні «Полымя». — **К. Л., В. С.**). *Штогод у сярэднім выдаецца 135 назваў кніг на роднай мове. Выданне кніг расце па колькасці назваў, аб'ёму і тыражах. Калі ў 1947 годзе было выдадзена 46 назваў кніг агульным аб'ёмам 379 друкаваных аркушаў, тыражом 560 тысяч экзэмпляраў, то ў 1957 годзе — 89 назваў кніг агульным аб'ёмам 829 друкаваных аркушаў, тыражом 1226 тысяч экзэмпляраў. У 1966 годзе выдадзена 136 назваў беларускай мастацкай літаратуры на беларускай мове агульным аб'ёмам 1198 друкаваных аркушаў, тыражом 3802 тысячы экзэмпляраў, у 1967 годзе — 135 назваў агульным аб'ёмам 1173 друкаваных аркушы, тыражом 3735 тысяч экзэмпляраў. На 1968 год запланавана выдаць* (даведка была датавана сакавіком 1968 года. — **К. Л. , В. С.**) *181 кнігу агульным аб'ёмам 1672 друкаваных лістоў, тыражом 5649 тысяч экзэмпляраў...»*

Міністр нагадвае, што яшчэ да V з'езда пісьменнікаў Беларусі Дзяржкамітэтам



***Вядомая ўсім настаўнікам і вучням серыя «Школьная бібліятэка» вядзе свой пачатак з 60-х гадоў мінулага стагоддзя.***

па друку сумесна з выдавецтвамі быў распрацаваны зводны план перавыдання найлепшых твораў беларускай літаратуры на 1966—1970 гадоў. Што ж было вызначана ў прыярытэтах? Зборы твораў вядомых літаратараў — Петруся Броўкі ў чатырох тамах, Івана Шамякіна ў пяці тамах, Аркадзя Куляшова ў чатырох тамах, Максіма Танка ў чатырох тамах, Міхася Лынькова ў чатырох тамах, Пятра Глебкі ў трох тамах, Янкі Брыля ў чатырох тамах, Пiміна Панчанкі ў трох тамах, Максіма Лужаніна ў трох тамах, Піліпа Пестрака ў пяці тамах, Івана Мележа ў пяці тамах. План выдання, падкрэслівае Рыгор Канавалаў, быў разгледжаны ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі. Па прапанове праўлення Саюза пісьменнікаў у план дадаткова было ўключана выданне Збору твораў Аляксея Кулакоўскага ў чатырох тамах (яно і зразумела: «забыліся» ж на сакратара партыйнай арганізацыі).

З даведкі старшыні Дзяржкамдруку: *«...Кожны з выдадзеных Збораў твораў выпушчаны ў свет тыражом ад 5,5 да 10 тысяч экзэмпляраў.*

*У Дзяржаўным камітэце Савета Міністраў БССР па друку разгледжана пытанне аб выданні новых Збораў твораў Я. Купалы, Я. Коласа і К. Чорнага. Да працы над выпускам твораў гэтых пісьменнікаў выдавецтвы павінны падыйсці ў 1971 годзе. Ужо зараз вядзецца падрыхтоўка і рэдагаванне тэкстаў.*

*Выйшлі ў свет першыя два тамы «Гісторыі беларускай літаратуры», падрыхтаваныя Інстытутам літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук БССР. У гэтых тамах асвятляецца савецкі перыяд гісторыі беларускай літаратуры. Падрыхтаваны і знаходзяцца ў вытворчасці два чарговых тамы «Гісторыі беларускай літаратуры», прысвечаныя яе дакастрычніцкаму перыяду. Пасля абмеркавання і дапрацоўкі «Гісторыі беларускай літаратуры» прапануецца выпусціць яе ў чатырох тамах у палепшаным афармленні ў якасці падпісного выдання...»*

Кіраўнік «кніжнага» міністэрства звяртае ўвагу, што ўжо выпушчаны юбілейныя выданні выбраных твораў Рамана Сабаленкі (у двух тамах), Аляксея Якімовіча (у двух тамах), Алеся Звонака і іншых пісьменнікаў. У 1968 годзе павінны выйсці кнігі выбраных твораў К. Буйло, Э. Валасевіча, А. Бачылы, А. Бажко, Н. Гілевіча, П. Пранузы, А. Пысіна. Выдавецтвам «Беларусь» сумесна з Прэзідыумам праўлення Саюза пісьменнікаў БССР распрацаваны, а Дзяржкамітэтам па друку быў ухвалены план выпуску серыі «Бібліятэка беларускай прозы». У гэты план па прапанове Саюза пісьменнікаў БССР уключаны 24 кнігі аб'ёмам па 20—30 аркушаў кожная. Меркавалася, што ўсе гэтыя кнігі будуць перавыданнем найлепшых твораў пісьменнікаў на беларускай мове. Зазірніце сёння ў букіністычныя аддзелы сучасных кнігарняў ці ў інтэрнэт-крамы па продажы старых кніг, і вы знойдзеце нямала назваў кніг гэтай аўтарытэтнай серыі. Відавочна, што і цяпер да зборнікаў, выдадзеных пад «брэндам» «Бібліятэка беларускай прозы», звяртаюцца і чытачы новых пакаленняў, і даследчыкі беларускай літаратуры.

Сёння ідзе шмат спрэчак на тэму ўвагі да паэзіі. Тыражы вершаваных зборнікаў у большасці сваёй «дасягнулі» крытычнай мяжы ў 200—300 экзэмпляраў і выдаюцца большай часткай у прыватных выдавецтвах за кошт саміх аўтараў. Хіба што можна падзякаваць выдавецтву «Мастацкая літаратура» за стварэнне новага «паэтычнага» праекта — «Новая бібліятэка беларускай паэзіі». І выбар аўтараў даволі шырокі і годны, і тыражы з разлікам, што кніга можа патрапіць у самыя розныя бібліятэкі краіны, а таксама знайсці свайго чытача праз кнігарні ААТ «Белкніга» ці сталічную «Акадэмкнігу».

Але ж вернемся ў 1960-я... З даведкі Р. Канавалава: *«...Сумесна з Саюзам пісьменнікаў Дзяржкамітэт па друку распрацаваў план выпуску серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі». У гэтую серыю ўвойдзе 60—70 кніг, якія ўключаюць найлепшыя творы класікаў беларускай літаратуры і сучасных паэтаў. У Камітэце было разгледжана афармленне серыі. Дзяржкамітэт па друку і сакратарыят праўлення Саюза пісьменнікаў БССР зацвердзіў рэдакцыйную калегію «Бібліятэкі беларускай паэзіі» ў складзе П. Панчанкі (галоўны рэдактар), М. Танка, М. Лужаніна, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна.*

*У 1967 годзе ў гэтай серыі выйшлі кнігі М. Чарота, П. Труса, В. Таўлая, Ц. Гартнага і калектыўны зборнік «Крывёю сэрца», у які ўвайшлі лепшыя творы беларускіх паэтаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У план выдавецтва «Беларусь» на 1968 год па прапанове Саюза пісьменнікаў БССР уключаны і выйдуць у серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі» кнігі выбраных вершаў З. Астапенкі, У. Хадыкі, Я. Пушчы, В. Віткі, П. Макаля. У 1969 годзе ў гэтай серыі мяркуецца выпусціць кнігі вершаў Ю. Таўбіна, А. Русецкага, М. Васілька, Г. Бураўкіна.*

**Сёння ідзе шмат спрэчак на тэму ўвагі да паэзіі. Тыражы вершаваных зборнікаў у большасці сваёй «дасягнулі» крытычнай мяжы ў 200—300 экзэмпляраў. І выдаюцца большай часткай у прыватных выдавецтвах за кошт саміх аўтараў.**

*Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па друку прыняў рашэнне пра штогадовае выданне зборніка «Дзень паэзіі». Ужо выдадзены тры зборнікі «Дня паэзіі» (1965, 1966, 1967 гады). Па віне праўлення Саюза пісьменнікаў БССР зборнік «Дзень паэзіі. 1968» да гэтага часу не паступіў у выдавецтва».*

І хоць зварот у ЦК і да ўрада з боку пісьменніцкай арганізацыі насіў відавочна крытычны характар (інакш бы не звярталіся!), са справаздачы Канавалава вынікае, што робіцца ўсё ж шмат, і прагрэсіўны рух ад аднаго дзесяцігоддзя да другога навідавоку. Ва ўсе часы (а сёння, у XXI стагоддзі, як ніколі!) выклікаў занепакоенасць стан драматургіі, сітуацыя з выданнем п'ес — таксама. Не забыліся ў Дзяржкамдруку і пра драматургію... *«Сумесна з Саюзам пісьменнікаў і Інстытутам літаратуры імя Я. Купалы Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па друку склаў спіс найлепшых п'ес беларускіх пісьменнікаў, якія ўвойдуць у серыю «Бібліятэка беларускай драматургіі» (выдаецца замест раней запланаванага трохтомніка «Беларуская драматургія»). Гэты спіс быў узгоднены з Міністэрствам культуры БССР. У серыі «Бібліятэка беларускай драматургіі» павінна выйсці каля 30 кніг. Ужо выдадзены п'есы У. Галубка («Суд», «Пісаравы імяніны», «Ганка»), В. Дуніна-Марцінкевіча («Пінская шляхта»), А. Макаёнка («Выбачайце, калі ласка»). Выданне серыі кніг «Бібліятэка беларускай драматургіі» будзе прадоўжана на працягу некалькіх гадоў...»* Магчыма, зважаючы, безумоўна, на адметнасці сённяшняга часу, вопыт паўвекавой даўнасці варта было б даволі пільна разгледзець і, магчыма, некаторыя творчыя выдавецкія праекты ўзяць на ўзбраенне. Тым больш што пастаноўка п'ес айчынных аўтараў — не такая частая з'ява ў сучасным тэатры.

З даведкі Дзяржкамдруку: *«...Прынята прапанова Саюза пісьменнікаў БССР пра серыйнае выданне першых кніг маладых беларускіх паэтаў. Выпуск гэтай серыі пачнецца ў бягучым годзе і будзе рэгулярна працягвацца ў наступныя гады.*

*Выдавецтва прымае меры да павелічэння выпуска першых кніг маладых беларускіх аўтараў, паляпшае іх афармленне. У 1965 годзе было выдадзена 13 першых кніг маладых пісьменнікаў, у 1967 — 16, на 1968 запланавана — 16, на 1969 — 19. Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па друку, Упраўленне кніжнага гандлю і Белкаапсаюз (так, у Белкаапсаюзе актыўна гандлявалі кнігай у самых далёкіх рэгіёнах рэспублікі! —* **К. Л., В. С.**) *прымаюць меры, скіраваныя на паляпшэнне прапаганды кніг маладых аўтараў, павелічэнне іх тыражоў».*

Дзякуючы такім рашэнням, развіццю ўвагі да выдання кніг маладых пісьменнікаў у серыі «Першая кніга паэта» ў 1965—1969 гадах пабачылі свет вершаваныя зборнікі Міколы Федзюковіча — «Зямля-магніт», Сымона Блатуна — «Раўнавага», Яўгена Крупенькі — «Салаўі», Яўгена Шабана — «Нарачанка», Яўгена Вераб'я — «Свежасць», Казіміра Камейшы — «Восеньскія позвы», Уладзіміра Скарынкіна — «Буслы над аэрадромам», Рыгора Семашкевіча — «Леснічоўка», Юркі Голуба — «Гром на зялёнае голле», Леаніда Дайнекі — «Галасы», Міхася Казакова — «Млечны шлях» ... Гэтых аўтараў і многіх іх равеснікаў імёны і творы і сёння — у полі зроку, пад прыцэлам чытацкай увагі сапраўдных аматараў паэтычнага слова. Хоць вершы некаторых з тагачаснай кагорты маладых паэтаў і не перавыдаюцца цяпер... Значыць ідзе пошук тых даўніх і шмат для каго не забытых кніг.

Менавіта да другой паловы 1960-х гадоў адносіцца і нараджэнне добра вядомай і сённяшнім бібліятэкарам, настаўнікам роднай літаратуры, ды і рускай літаратуры таксама, яшчэ адной серыі... З даведкі старшыні Дзяржкамдруку: *«...Дзяржаўным камітэтам Савета Міністраў БССР па друку сумесна з Міністэрствам асветы БССР распрацаваны перспектыўны план выпуску «Школьнай бібліятэкі», куды ўвайшлі творы беларускіх пісьменнікаў, якія вывучаюцца ў школе, а таксама кніг для пазакласнага чытання. У план на 1966—1970 гады ўключана каля 50 кніг. З цягам часу «Школьная бібліятэка» будзе папаўняцца новымі творамі. Штогод у гэтай бібліятэцы выходзяць у сярэднім 8—10 кніг. У выніку работы, праведзенай Міністэрствам асветы БССР, Упраўленнем кніжнага гандлю па друку Дзяржкамітэта па друку і Белкаапсаюзам, тыражы кніг, якія ўваходзяць у «Школьную бібліятэку», істотна выраслі.*

*Улічваючы запыты і пажаданні настаўнікаў і навучэнцаў, Дзяржкамітэт па друку дарučыў выдавецтву «Народная асвета» выпусціць у 1968 годзе кнігу крытычных артыкулаў, прысвечаных творам беларускай літаратуры, якія вывучаюцца ў сярэдняй школе. Кніга гэта рыхтуецца да друку і ў бягучым годзе выйдзе ў свет. Выданне падобных зборнікаў будзе практыкавацца і надалей...»*

І пісьменнікам, і ЦК, і ўраду Дзяржкамдрук, відавочна, не адказаў гэтай даведкай на ўсе пытанні. Дакладней, рэчаіснасць яшчэ не дацягвала да жаданняў, памкненняў творчай грамадскасці бачыць плён сваёй працы больш тыражным і запатрабаваным. Вось толькі і гэтыя стасункі нагадваюць, што вечнай дылемай у пытаннях запатрабаванасці з'яўляюцца як мінімум два супярэчлівыя судакрананні — мастацкія вартасці зробленага і ўзровень падрыхтаванасці, інтэлектуальнай зацікаўленасці спажыўца, ці, кажучы больш прама, зацікаўленасці патэнцыйнага чытача...

**Кастусь ЛЕШНІЦА,**
**Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, УНП 400395996 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов**
**Адрес: Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. Ленинская, 6-1**

## Административное помещение № 1 – 746,8 кв. м

(инв. номер 331/D-1317, составные части и принадлежности: электроснабжение, теплосеть, водопровод, канализация)

***Обременение*:** площади помещения сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена лота без НДС – 221 553,63 бел. руб.** (снижена на 50 %)

Шаг электронных торгов составляет 5 % от начальной цены предмета электронных торгов

**Порядок осмотра:** по предварительному согласованию в рабочие дни с 8.30 до 17.15 – Симанович Зинаида Юльевна, +375 29 607-08-25

Задаток **44 310,73 бел. руб.** перечисляется на р/с BY47BELB 30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. По письменному заявлению покупателя может быть предоставлена рассрочка оплаты стоимости имущества на срок до 3 лет с ежемесячной индексацией платежей согласно договору купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by, с соблюдением требований, установленных Положением «О порядке проведения электронных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики от 12.07.2013 № 608 «О проведении электронных торгов» (в ред. постановления Совмина от 01.12.2023 № 846).
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, которое является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи предмета электронных торгов, указанной в протоколе о результатах электронных торгов, либо в протоколе о признании электронных торгов несостоявшимися, в случае согласия претендента на покупку на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.01.2024

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 18.03.2024 с 11.00 до 11.10.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.03.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

---

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества**

## ОАО «Белхозторг-1М»

Аукцион состоится **15.03.2024 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

### Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 700/С-13339 – Магазин № 3,

**площадь – 457,2 кв. м, назначение: здание специализированное розничной торговли.**

Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000003002329 (право постоянного пользования, пл. 1,9028 га, целевое назначение земельного участка: земельный участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений, отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен) по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Гастелло, 20/5.

***Начальная цена продажи: 314 880,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 31 488,00 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 14.03.2024 до 11.00.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

**Доп. информацию можно получить по тел. +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | Частное торговое унитарное предприятие «Зеленый эдем», 246043, г. Гомель, ул. Бочкина, д. 195 |

**Предметы электронных торгов:**

**Грузовой седельный тягач DAF XF 460 FT,** р/зн. АМ 6191-3, 2016 г. в.

**Полуприцеп фургон-рефрижератор SCHMITZ SK024,** р/зн. А 7619 А-3, 2007 г. в.

**Местоположение:** Минский р-н, п. Привольный, ул. Мира, 2а

**Начальная цена с НДС 20 % – 270 000,00 бел. руб.**

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 01.04.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **29.03.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

---

**Открытое акционерное общество**

## «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 4»

**сообщает, что 29 марта 2024 года в 11.00**

**СОСТОИТСЯ ГОДОВОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**в актовом зале по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17.**

**Повестка дня:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год и основных направлениях развития Общества на 2024 год.
2. О работе наблюдательного совета в 2023 году. Оценка деятельности генерального директора Общества наблюдательным советом.
3. О результатах проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год.
4. О результатах аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2023 год. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества.
5. Об утверждении порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2023 год. О выплате дивидендов за 2023 год.
6. Об утверждении порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении Общества, на 2024 год и первый квартал 2025 года. Периодичность выплаты дивидендов за 2024 год.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен согласно реестру владельцев ценных бумаг эмитента, сформированного на 11 марта 2024 года.

Время и место ознакомления лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, с материалами по вопросам повестки дня собрания: с 7 марта 2024 года по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, каб. 310 с 10.00 до 17.00 в рабочие дни, в день проведения собрания – с 09.00 до 10.00.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 10.00 до 10.45 для акционеров Общества по представлению паспорта, для представителя акционера – по предъявлении паспорта и доверенности.

Телефон для справок **+375 17 334 33 64.**

УНП 100055368

***Наблюдательный совет.***

---

*По решению совета директоров ЗАО «Отделочник-198» г. Молодечно (протокол № 2/2024 от 26.02.2024 г.)*

**26 марта 2024 г.**

по адресу: г. Минск, ул. Московская, дом 20, 4-й этаж, помещение 2-44 состоится

**годовое общее собрание акционеров**

## ЗАО «Отделочник-198»

г. Молодечно

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1.** Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ЗАО «Отделочник-198» г. Молодечно за 2023 год.
**2.** О работе совета директоров ЗАО «Отделочник-198» г. Молодечно.
**3.** Утверждение заключения ревизионной комиссии за 2023 год.
**4.** Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности (данных книги учета доходов и расходов) ЗАО «Отделочник-198» г. Молодечно за 2023 год.
**5.** О покрытии убытков по итогам работы Общества за 2023 год.
**6.** Избрание членов совета директоров ЗАО «Отделочник-198» г. Молодечно.
**7.** Избрание членов ревизионной комиссии ЗАО «Отделочник-198» г. Молодечно.
**8.** Определение размеров вознаграждений членов совета директоров и ревизионной комиссии ЗАО «Отделочник-198» г. Молодечно и порядка их выплаты.

**Время начала собрания: 16.00.**

**Порядок регистрации лиц, имеющих право на участие в собрании:** в день проведения собрания с 15.50 до 15.57 по адресу: г. Минск, ул. Московская, дом 20, 4-й этаж, помещение 2-44.

Для регистрации при себе иметь: акционеру общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список акционеров (реестр) для участия в собрании будет составлен по состоянию на **22 марта 2024 г.**

**С материалами, подлежащими предоставлению акционерам при подготовке к проведению годового общего собрания акционеров, можно ознакомиться** по месту нахождения Общества в рабочие дни, начиная с 19 марта 2024 г. по 25 марта 2024 г., г. Минск, ул. Московская, дом 20, 4-й этаж, помещение 2-44 с 11.45 до 12.00; 26 марта 2024 г. – по месту проведения собрания.

Контактный телефон **8-029-369-49-73.**

УНП 600205188

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению **открытого акционерного общества «Смолевичи-Сузон»** (продавец) проводит открытый аукцион

## ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДСКОГО ПОМЕЩЕНИЯ

**с инв. № 614/D-23691 общей площадью 372,2 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Смолевичский район, г. Смолевичи, ул. Торговая, 14И-1.**

*Сведения о земельном участке: кадастровый номер* 624850100002001324 *(право аренды по 25 февраля 2033 г., доля в праве – 169/200),* площадь 5,5019 га, *имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей, пл. 0,2295 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **144 000,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **14 400,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826 00169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 10 (десяти) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **02.04.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.04.2024** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11,**
**тел. для осмотра: (801776) 5-61-85, (8029) 170-03-63.**

УНП 691747895

---

**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот: изолированное помещение с инвентарным номером 141/D-7563 (наименование: столовая; назначение: помещение общественного питания) площадью 129,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Хмелевский с/с, аг. Хмелево, ул. Центральная, 41-4**

| **Начальная цена, руб. (с учетом НДС)** | 4 230,55 | **Размер задатка, руб.** | 423,06 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Хмелево» 225127, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Хмелево, ул. Центральная, 66, тел./ф 80164162533. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** до 10 дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 19 марта 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также ее можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 18 марта 2024 г. до 17.00**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысна ведаць

# Атрута на талерцы?

## Чым небяспечныя сродкі для мыцця посуду

**Калі верыць рэкламе, сучасныя сродкі для мыцця посуду ўвільгатняюць рукі лепш за крэм і насычаюць скуру вітамінамі. Урачы папярэджваюць: гэта не так. Спецыялісты раяць вельмі ўважліва ставіцца да выбару мыйных сродкаў, бо некаторыя з іх могуць прывесці да цэлага шэрагу непрыемнасцяў.**



Мыйныя сродкі для мыцця посуду складаюцца з паверхнева-актыўных рэчываў, араматызатараў і іншых хімічных матэрыялаў, якія могуць уплываць на ўсе сістэмы арганізма.

— Вылучаюць некалькі разнавіднасцяў паверхнева-актыўных рэчываў (яны дазваляюць расчапляць тлустыя кіслоты нават у халоднай вадзе). Самымі шкоднымі лічацца аніённыя, яны найбольш агрэсіўныя да скуры. Неіанагенныя менш агрэсіўныя і адносяцца да біяраскладальных рэчываў, — кажа **урач-лабарант Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана КЛІМУК.**

Самую вялікую шкоду для арганізма сродак для мыцця можа нанесці, калі вы дрэнна спаласняце посуд, і ён застанецца на талерцы. У такім выпадку разам з ежай у страўнік патрапяць хімікаты — паверхнева-актыўныя рэчывы, араматызатары і многае іншае. Рэгулярнае «паглынанне» гэтых хімікатаў спрыяе не проста харчоваму атручванню ці парушэнню абмену рэчываў, але і збою ў рабоце ўнутраных органаў, гастрыту, язве страўніка. З адным прыёмам ежы ў арганізм паступае нікчэмная доля шкодных рэчываў, але з часам іх колькасць сумуецца, кумулятыўны эфект можа прывесці да абвастрэння хранічных захворванняў і ўзнікнення алергічных рэакцый. Паводле ацэнак спецыялістаў, у год чалавек можа «з'ядаць» каля шклянкі сродкаў для мыцця посуду!

Любы сродак для мыцця посуду разбурае ахоўны пласт скуры і выклікае сухасць, лушчэнне, «выцягвае» са скуры вільгаць. Тут таксама ідзе назапашвальны эфект, можа здавацца, што з вашымі рукамі ўсё ў парадку, але з часам скура абязводжваецца і сохне. У алергікаў мыццё посуду голымі рукамі наогул можа прывесці да дэрматыту. Па гэтай прычыне мыць посуд заўсёды трэба толькі ў гумовых пальчатках і пасля мыцця выкарыстоўваць крэм для рук.

Як любое хімічнае рэчыва араматызатары ўплываюць на ўсе сістэмы арганізма, з якімі яны кантактуюць. Але колькасць араматызатараў, якая дадаецца ў сродкі для мыцця посуду, у здаровага чалавека не павінна выклікаць негатыўных рэакцый. Калі ж чалавек пакутуе алергічнымі захворваннямі, у комплексе з іншымі правакацыйнымі фактарамі араматызатар можа выклікаць дэрматыт і прыступ бранхіяльнай астмы.

— Выбіраючы мыйныя сродкі, вельмі старанна чытайце іх склад на этыкетцы. Важна, каб сярод кампанентаў не было штучных араматызатараў, эцілендыямінтэтраоцатнай кіслаты, а паверхнева-актыўныя рэчывы былі максімальна мяккімі (неіанагенныя). Для абароны арганізма рэкамендуецца разводзіць мыйныя сродкі вадой, вельмі старанна прамываць губку і апалосквацць посуд праточнай вадой не меней за 20 секунд, — раіць Святлана Клімук.

Калі вы жадаеце цалкам выключыць магчымасць негатыўнага ўплыву, не выкарыстоўвайце сродкі для мыцця посуду. Ёсць шмат альтэрнатыўных варыянтаў. Напрыклад, з выдаленнем тлушчу выдатна спраўляюцца харчовая сода або гаспадарчае мыла.

Скажыце, доктар...

# НЕ ДЫХАЕ НОС? СПРАВА Ў АДЭНОІДАХ

## Норма яны ці паталогія?

**Дзіця зноў хварэе, хоць толькі нядаўна папраўлілася? Нос у яго зноў не дыхае, а па начах з дзіцячага пакоя даносіцца недзіцячы храп? Падобна, гэта адэноіды, — вырашаеце вы. Што з гэтым рабіць? Разбіраліся ў няпростым пытанні разам з урачом-атарыналарынголагам 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Дар'яй ДЗЯНІСІК.**



***— Навошта нам адэноіды?***

— «Адэноіды», або адэноідныя вегетацыі (глотачная міндаліна), уяўляюць сабой гіпертрафію насаглотачнай міндаліны, якая часцей назіраецца ў дзяцей пачынаючы з узросту 3-5 гадоў. Адэноідныя вегетацыі ў дзіцячым узросце з'яўляюцца мяккімі і эластычнымі, аднак з часам яны становяцца больш шчыльнымі з прычыны таго, што частка лімфоіднай тканкі замяшчаецца злучальнай тканкай, з чаго і пачынаецца працэс іх інвалюцыі.

«Адэноід» багата васкулярызаваны, залозы вылучаюць вялікую колькасць слізі, якая ўтрымлівае лейкацыты, лімфацыты, макрафагі. Такім чынам глоткавая міндаліна нясе значную частку ахоўнай і інфармацыйнай функцый для ўсіх складнікаў арганізма чалавека, адыгрывае ключавую ролю ў фарміраванні мясцовага імунітэту, бо знаходзіцца на шляху ўдыхальнага паветра.

***— Чаму адэноіды разрастаюцца?***

— У кожнага чалавека на слізістай носа і поласці насаглоткі знаходзіцца свая мікрафлора (мікрабіём), у большасці выпадкаў вызначаецца манафлора і толькі ў 2-3 % спалучаюцца два віды мікробнай і грыбковай флоры. Аднак пры збоі ахоўнага складніку арганізма (астуджэнне, вірусная нагрузка, траўмы і інш.) пастаянная мікрафлора становіцца ўмоўна-патагеннай і падтрымлівае запаленне да таго часу, пакуль арганізм не справіцца сам або з дапамогай лекавых прэпаратаў, якія дапамагаюць прывесці мікрафлору ў раўнавагу з арганізмам.

Пры гэтых умовах лімфоідная тканка глотачнай міндаліны ў дзіцяці можа павялічвацца за кошт вострай запаленчай рэакцыі, а затым адбываецца разрастанне лімфоіднай і злучальнай тканак. Калі арганізм не спраўляецца з інфекцыяй і адбываецца разрастанне адэноіднай тканкі, ужо можна казаць аб хранічным запаленні глотачнай міндаліны — адэноідыце.

***— Як ён праяўляецца?***

— Асноўныя скаргі, якія прад'яўляюць дзеці і іх бацькі, — цяжкасць насавога дыхання, храп, кашаль, пераважна ў ранішні час, гугнявасць. Пры рынаскапіі ў большасці выяўляецца ацёк слізістай абалонкі носа, пры фарынгаскапіі — сцяканне слізістага або слізіста-гнойнага аддзяляльнага па задняй сценцы глоткі.

Для ўстанаўлення дыягназу недастаткова адных толькі прыкмет адэноідыта, патрабуецца агляд насаглоткі: задняя рынаскапія, пальпацыя насаглоткі, рэнтгенаграфія насаглоткі, эндаскапія насаглоткі. Пры даследаванні вызначаецца не толькі іх наяўнасць, але і іх велічыня, стан. Велічыня вызначаецца трыма ступенямі. Першая ступень, калі ніжні край дасягае ўзроўню верхняй часткі сашніка; другая ступень, калі ніжні край дасягае задняга канца сярэдняй насавой ракавіны; трэцяя ступень, калі ён дасягае ўзроўню ніжняй насавой ракавіны і ніжэй.

***— Калі ж лічыцца, што адэноіды — паталогія?***

— Абцяжарваючы і выключаючы насавое дыханне з прычыны хранічнага запалення, адэноіды схіляюць не толькі да частых запаленчых інфекцый верхніх дыхальных шляхоў і сярэдняга вуха, але і выклікаюць цэлы шэраг структурных і функцыянальных змен: зніжэнне слыху, няправільнае развіццё зубасківічнай сістэмы, бледнасць, зніжэнне апетыту, аслабленне памяці, павышаную стамляльнасць, шумнае дыханне, прыпынкі дыхання ў сне, галаўныя болі, начное нетрыманне мачы, прыступы кашлю і інш.

Найбольш эфектыўным і простым метадам лячэння адэноідных вегетацый з'яўляецца іх аператыўнае выдаленне — адэнатамія. Паказанні да яе абгрунтоўваюцца не толькі велічынёй насаглотачнай міндаліны, але ў большай ступені ўсёй сімптаматыкай прама ці ўскосна звязанай з ёй паталогіі.

Далікатная праблема

# Хламідыёз: распаўсюджаны і вельмі небяспечны

**Па статыстыцы, асноўнымі ахвярамі палавога заражэння гэтай інфекцыяй становяцца маладыя людзі ва ўзросце 20—35 гадоў. Жанчыны заражаюцца ў пяць разоў часцей, чым мужчыны. І самае страшнае — хламідыёз вельмі цяжка і дыягнаставаць, і лячыць.**

### Вераломства бессімптомнасці

— Хламідыёз — інфекцыйнае хранічнае захворванне слізістых абалонак чалавека, якое часта развіваецца схавана. Акрамя мочапалавой сістэмы, інфекцыя можа паражаць слізістыя абалонкі іншых органаў — вока, дыхальных шляхоў, страўнікава-кішэчнага тракта, а таксама суставы, — характарызуе інфекцыю **урач-дэрматавенеролаг, загадчык дыспансернага аддзялення Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансера Вячаслаў РОСЛІК.**

Узбуджальнікам хваробы з'яўляецца надзвычай маленькі мікраарганізм — хламідыя, які займае прамежкавае становішча паміж вірусамі і бактэрыямі.

Механізм перадачы інфекцыі кантактны — палавым і непалавым (бытавое заражэнне) шляхамі.

Хламідыйная інфекцыя можа працякаць з выяўленай сімптаматыкай, але часцей характэрная бессімптомная яе плынь. Прыкметы заражэння з'яўляюцца, як правіла, праз 10—14 дзён пасля палавой сувязі, часам пазней, прычым хворы не заўсёды адразу іх заўважае і нейкі час лічыць сябе здаровым.

— У пачатку захворванне працякае з сімптомамі запаленчага паражэння мочапалавой сістэмы: празрыстыя або мутнаватыя выдзяленні, перыядычныя рэзі пры мочапусканні, сверб, якія ўзмацняюцца пасля прыёму вострай ежы і алкаголю. Прыкладна праз 2-3 тыдні пасля названых сімптомаў можа ўзнікнуць паражэнне вачэй: пачырваненне слізістай абалонкі, якое ўзмацняецца пры яркім святле, моцнае слёзацячэнне. Усё гэта можа знікнуць без лячэння, але праз некаторы час не выключана абвастрэнне, — кажа Вячаслаў Рослік.

Найбольш яркай прыкметай інфекцыі з'яўляецца запаленне суставаў. Прычым пашкоджваюцца пераважна буйныя — каленныя, галёнкаступнёвыя, тазасцегнавыя, міжпазваночныя. Артрыт характарызуецца моцнымі болямі, прыпухласцю ў вобласці суставаў і пачырваненнем скуры над імі.

Аднак вострыя праявы хваробы звычайна працягваюцца ад двух месяцаў да паўгода, пасля чаго ў стане хворага надыходзіць паляпшэнне. Але знікненне прыкмет захворвання не сведчыць аб выздараўленні. Досыць хвораму пераахаладзіцца, прыняць алкаголь ці вострую ежу, як самаадчуванне зноў пагаршаецца.



### Без самалячэння!

Для дыягнастыкі хламідыёзу неабходна правядзенне лабараторных даследаванняў, якія з'яўляюцца вызначальнымі ў пастаноўцы дыягназу.

— Дыягностыка праводзіцца рознымі метадамі: ІФА, ПЦР. У якасці матэрыялу для даследавання выкарыстоўваецца мазок з урэтры, цэрвікальнага канала, вока, а таксама кроў, — адзначае ўрач.

Лячэнне хламідыйнай інфекцыі і выкліканых ёй ускладненняў павінна быць комплексным. З сучасных антыбактэрыяльных прэпаратаў, актыўных у дачыненні да хламідый з улікам біялагічных уласцівасцяў ўзбуджальніка прымяняюцца макраліды, тэтрацыкліны і фторхіналоны. Працяглая плынь і вялы характар захворвання выклікаюць зніжэнне імунітэту і патрабуюць прызначэння прэпаратаў, якія ўзмацняюць імунітэт, і сродкаў для стымуляцыі неспецыфічнай абароны.

Лячэнне хламідыёзу праводзіцца ў залежнасці ад клінічнай карціны ва ўролага, гінеколага, дэрматавенеролага і рэўматолага. Пры гэтым важна ўсведамляць, што ад хламідыёзу не існуе хатніх і народных сродкаў лячэння. Пры наяўнасці непрыемных сімптомаў абавязкова трэба звярнуцца да ўрача.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Память-В»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль ЗИЛ 1-8т бортовой, инв. № 042, введено в экспл. 01.06.07, Шифр 50401 | 5130,00 | 513,00 | 256,50 |
| 2 | Электроталь, инв. № 024, введено в экспл. 01.12.87, Шифр 41721 | 378,00 | 37,80 | 18,90 |
| 3 | Машина пескоструйная, инв. № 037, введено в экспл. 01.10.04, Шифр 42003 | 1080,00 | 108,00 | 54,00 |
| 4 | Плиткорезный станок tsrb1000, инв. № 072, введено в экспл. 27.06.13, Шифр 44137 | 252,00 | 25,20 | 12,60 |
